

ШТО ЎПЛЫВАЕ НА РЫНАК ЖЫЛЛЯ? 6

ЯК НЕ СТАЦЬ АХВЯРАЙ ПРЭЗЕНТАЦЫЙ? 19



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

26 САКАВІКА 2021 г.
ПЯТНІЦА
№ 56 (29425)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TV ПРАГРАМА

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Таццяна БРАНЦЭВІЧ, намеснік міністра эканомікі:**

*«У бягучай пяцігодцы плануецца паэтапнае павышэнне заработнай платы асобным катэгорыям работнікаў бюджэтнай сферы: педагогам — да ўзроўню сярэдняй па краіне, урачам — у 1,5 раза вышэй за сярэднерэспубліканскі ўзровень, сярэдняму медперсаналу — да 90 %, а работнікам сферы сацыяльнага абслугоўвання і культуры — да 80 % ад сярэднерэспубліканскага ўзроўню».*

## КОРАТКА

- **Беларусь і Манголія абмеркавалі абмен візітамі на найвышэйшым і высокім узроўнях.**
- Мінпрацы: суадносіны сярэдняй пенсіі па ўзросце і сярэдняй зарплаты ў лютым перавысілі 40 %.
- **Партыю кітайскай вакцыны ад каранавіруса даставілі ў Брэсцкую вобласць.**
- Аб'яўлены конкурс рэжысёрскіх канцэпцый галаканцэртаў Дня беларускага пісьменства.
- **Сезон вясновых кірмашоў у Мінскай вобласці пачнецца 27 сакавіка.**



- У Слаўгарадзе каля школы знойдзены боепрыпас часоў вайны — эвакуіраваны 552 чалавекі.
- **У пяці дамах-інтэрнатах Віцебскай вобласці перайшлі на звычайны рэжым працы.**

# Прафесія — злучаць берагі



Унікальны першы ў Беларусі вантавы мост узводзіцца на Дняпры каля Рагачова. Трэба патлумачыць, што словам «вант» абазначаюць сістэму забеспячэння нясучай здольнасці арачнага праектнага збудавання. Рагачоўская мостанавабудоўля распачата год таму, замест старога моста ўзводзяць новы. Над мостам ужо ўзнесліся аркі, якія і трымаюць канструкцыю. Мне давялося прысутнічаць і здымаць, як будаўнікі філіяла мостабудаўнічага гомельскага ўпраўлення № 4 ААТ «Мостабуд» манціравалі і правяралі надзейнасць мантажу вантавай канструкцыі.

На здымку — бетоншчыкі Юрый ЛОНСКІ і Уладзімір МАСЛО разам са старшым прарабам Аляксеем ВАЛЕВІЧАМ *(на першым плане)*. Дарэчы, 38-гадовы праараб працуе сямнаццаць гадоў на мостабудоўлі, удзельнічаў у будоўлях больш чым сарака маставых беларускіх пераходаў, аднаўляў і вядомы мост на Прыпяці, што каля Турава.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

### Размова па сутнасці

**Віталь ДРОЖЖА:**

## «Лес — рэсурс, які мы павінны выкарыстоўваць рацыянальна»

**Наша краіна сёння ўваходзіць у першую дзясятку лясных дзяржаў Еўропы, а лясная гаспадарка дэманструе значныя поспехі як у лесааднаўленні, так і ў дрэваапрацоўцы. Якія складнікі прывялі да такіх вынікаў? Пра гэта «Звязда» спытала міністра лясной гаспадаркі Віталя Дрожжу.**



Фота прэс-службы Мінлясгаса.

***— Віталь Аляксандравіч, сёння лясная гаспадарка — сістэма, якая працуе эфектыўна. Дзякуючы чаму ўдалося яе выбудаваць?***

— Калі казаць коратка, наша галіна заўсёды працавала досыць эфектыўна. У нас дастаткова лясных і выдатныя працоўныя рэсурсы. Акрамя таго, мы штогод дадавалі і інвесціравалі ў галіну, выкарыстоўвалі ў тым ліку міжнародны вопыт — усё гэта ў комплексе дазволіла выбудаваць мадэль, якая эфектыўна працуе.

СТАР. 4

### На слыху

## Пачаўся выпуск прамысловых партый «Спадарожнік V»

**На прадпрыемстве «Белмедпрэпараты» пачаўся прамысловы выпуск расійскай вакцыны супраць каранавіруса. Яна будзе выкарыстоўвацца для вакцынацыі насельніцтва пачынаючы з апошняй дэкады красавіка. Штомесяц плануецца выпускаць 500 тысяч доз прэпарату, паведамляе прэс-служба Міністэрства аховы здароўя.**

Разліў прамысловых серый вакцыны «Спадарожнік V» ажыццяўляецца з паўпрадукту расійскай кампаніі АТ «Генерыум», якая ўваходзіць у структуру АТ «Фармстандарт».

Як адзначыў **генеральны дырэктар РУП «Белмедпрэпараты» Сяргей БЯЛЯЕЎ,** вакцына можа выкарыстоўвацца для насельніцтва з апошняй дэкады красавіка, калі будуць атрыманы вынікі кантролю якасці.

— На працягу найбліжэйшых трох тыдняў будуць праводзіцца мерапрыемствы па кантролі якасці. Вакцына будзе праходзіць поўную праверку па ўсіх паказчыках для пацвярджэння якасці і бяспекі, — сказаў Сяргей Бляляеў. Названыя мерапрыемствы пройдуць у цэнтры імя М. Ф. Гамалеі — распрацоўшчыка вакцыны.

Генеральны дырэктар адзначыў, што першая валідацыйная серыя вакцыны «Спадарожнік V», якая выраблялася на «Белмедпрэпаратах» з канца лютага, таксама прайшла неабходнае лабараторнае пацвярджэнне. Атрыманы прадукт аказаўся цалкам ідэнтычны арыгінальнаму і прайшоў па ўсіх паказчыках якасці.

СТАР. 5

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Падпішыся на «Звязду» – і выйграй карысны прыз!

Ідзе падпіска на II квартал 2021 года

ВЯСНА І ЛЕТА — З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ!

З першых вуснаў

# «Нам не можа перашкодзіць ні пандэмія, ні знешнія спробы расхістаць палітычную сітуацыю»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў сустрэчу з губернатарам Прыморскага краю Расіі Алегам КАЖАМЯКАМ.**

Губернатар Прымор'я — часты госць беларускай сталіцы. З мінулага візіту прайшло шэсць месяцаў. Гэта яшчэ раз даказвае, што Далёкі Усход зацікаўлены ў супрацоўніцтве з Беларуссю. З-за пандэміі летась тавараабарот расійскага Прымор'я і Беларусі зменшыўся ў параўнанні з 2019 годам на два мільёны долараў ЗША і склаў 17,2 мільёна. Але ўжо ў студзені партнёры выйшлі на стабільны рост. За першы месяц новага года нагандлявалі на 2,5 мільёна, што амаль у чатыры разы больш за аналагічны перыяд 2020-га.

«Вашы візіты ў Беларусь сталі добрай традыцыяй, таму і вынік ёсць», — адзначыў на пачатку сустрэчы Аляксандр Лукашэнка, запэўніўшы, што «так будзе і далей».

Па словах Прэзідэнта, пры падтрымцы Алега Кажамякі паспяхова рэалізаваны шэраг важных сумесных праектаў на тэрыторыі Расіі.

«Таму ваша зацікаўленасць у тым, каб двухбаковых кантактаў было больш і яны ахопліваі новыя сферы, шукалі перспектыўныя напрамкі, абсалютна правільная. Мы разам нацэлены на канкрэтны вынік. І нам не можа перашкодзіць ні пандэмія, ні знешнія спробы расхістаць палітычную сітуацыю ў нас і ў вас. Падзеі апошніх месяцаў паказалі, што ў нялёгкія моманты выпрабаванняў, падкінутых нам звонку, абедзве краіны могуць разлічваць на падтрымку і дапамогу», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт Беларусі, карыстаючыся сустрэчай, падзякаваў былому паслу Расіі ў Беларусі Дзмітрыю Мезенцаву.

Як дадаў Аляксандр Лукашэнка, Прыморскі край — даўні і перспектыўны партнёр нашай краіны на Далёкім Усходзе.

«Уладзівасток далёка, але ён нам не чужы. Наша Айчына ад Брэста да Уладзівастока так і засталася. Як бы хто ні матляўся — гэта наша Айчына. Ёсць суверэнныя, незалежныя дзяржавы на велізарнай гэтай прасторы (так размеркавала жыццё), але гэта наша зямля», — мяркуе Прэзідэнт.

Ён прывёў статыстыку па гандлі. Тавараэварот прасеў на пару мільёнаў долараў, але студзень 2021 ужо дае падставу сцвярджаць, што партнёры ў стане не толькі выйсці на былы ўзровень эканамічнага ўзаемадзеяння, але і перавысіць яго.

Паводле слоў Прэзідэнта, пасля апошняй сустрэчы з губернатарам у верасні прыкметна актывізаваліся дзелавыя кантакты: праведзена два пасяджэнні рабочай групы па супрацоўніцтве паміж нашай краінай і Прыморскім краем, рэгіён наведалі многія кіраўнікі беларускіх прадпрыемстваў.

«Несумненна, такая актыўная праца прынясе свае практычныя дывідэнды, станоўча адаб'ецца на росце ўзаемнага гандлю і эфектыўнай рэалізацыі інфраструктурных праектаў», — падзяліўся Аляксандр Лукашэнка.

Ён пералічыў, што Беларусь гатовая прапанаваць спажыўцам Прымор'я: прадукцыю і тэхналогіі ў галіне прамысловасці, сельскай гаспадаркі, будаўніцтва і развіцця пасажырскага транспарту.

«Мы не ўводзілі ніякіх лакдаўнаў, нашы прадпрыемствы працавалі бесперабойна. І сёння мы маем усе магчымасці, каб паставіць для патрэб Прыморскага краю ўсё, што вам трэба. Што мы можам, вы ведаеце. Мы зацікаўлены пастаўляць вам не толькі машынабудаўнічую прадукцыю, але і прадукты харчавання. Але і гатовыя па нашых тэхналогіях (вопыт маем на Сахаліне) ствараць адпаведныя аб'екты па ўсіх кірунках», — падкрэсліў кіраўнік краіны.

Прэзідэнт адзначыў: ведае вялікую цікавасць Прымор'я да супрацоўніцтва ў будаўнічай галіне, і беларусы гатовы ўзвесці любы аб'ект пад ключ.

«Мы гатовыя падзяліцца любым вопытам па ўсіх кірунках, якія вас цікавяць, улічваючы, што вы — вялікі сябар Беларусі. У нас абсалютна няма закрытых тэм для абмеркавання», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

Алег Кажамяка расказаў, што за паўгода ўдалося дасягнуць значных поспехаў у супрацоўніцтве. У знешнім гандлі Прымор'я з краінамі СНД Беларусь займае 46 %, але ёсць і далейшы патэнцыял у адносінах.

«Перадусім (патэнцыял ёсць. — **«Зв.»**) у пытаннях, звязаных з пастаўкай тэхнікі. У 2020 годзе мы закупілі 177 адзінак тэхнікі разнастайнага кірунку. Па судносінах з мінулым годам амаль у два разы павялічылі — была закуплена тады 91 адзінка. Асабліва ролю адыгралі амаль перад новым годам пастаўленыя машыны, механізмы, тэхніка, што прыняла ўдзел у ліквідацыі ледзянога дажджу», — нагадаў Алег Кажамяка.

Па яго словах, ужо сфарміравана заяўка на пастаўку ў найбліжэйшыя гады каля 400 адзінак беларускай камунальнай тэхнікі для муніцыпальных адзінак Прымор'я.

У праграме візіту дэлегацыі таксама запланавана пасяджэнне рабочай групы па супрацоўніцтве Беларусі з Прыморскім краем, перагаворы з кіраўніцтвам міністэрстваў сельскай гаспадаркі і харчавання, будаўніцтва і архітэктуры, прамысловасці. Дэлегацыя наведала ААТ «МТЗ», агракамбінат «Ждановічы», шэраг будаўнічых аб'ектаў.

**Марыя ДАДАЛКА.**

### ❍ У тэму

**Беларускія будаўнікі займуцца ўзвядзеннем выставачнага цэнтра ва Уладзівастоку.**

Культурна-выставачны цэнтр будзе ўяўляць сабой вялікі будынак з сучаснай архітэктурай і, па словах Алега Кажамякі, стане ўпрыгожаннем усяго Азіяцка-Ціхаакіянскага рэгіёна.

«Там будуць прадстаўлены экспазіцыі Траццякоўкі, Эрмітажа, Рускага музея, Музея Усходу. Там будзе Марыінская тэатральная сцэна з магчымасцю прагляду оперы, балета. Калі гэта будзе зроблена беларускімі будаўнікамі, то стане значным унёскам у праект двух прэзідэнтаў. Гэта гісторыя на стагоддзі», — расказаў губернатар Прымор'я.

Акрамя беларускіх будаўнікоў, мяркуюць прыморцы запрасіць і замежных спецыялістаў, якія дапамогуць, напрыклад, з акустыкай і ўсталяваннем сцэны. Старт праекту плануецца даць у красавіку.

Сярод сумесных праектаў ва Уладзівастоку — заканчэнне заснавання ў верасні гандлёвага дома Беларусі. Яго адкрыццё плануюць прымеркаваць да прыезду Прэзідэнта Беларусі ў Прымор'е.

# ЁСЦЬ НЯМАЛА, АЛЕ МОЖНА БОЛЬШ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Казахстана ў Беларусі Аскарам БЕЙСЕНБАЕВЫМ.**

Па словах беларускага лідара, за апошні час краіны многага дасягнулі ў інтэграцыі па лініі ЕАЭС, у двухбаковых адносінах (гандлі, кааперацыі).

«Хацелася б, каб гэта была больш глыбокая кааперацыя, каб аб'ёмы пашыраліся. Мы гатовыя загружаць больш вытворчасць, ствараць дадатковыя зборачныя вытворчасці, загружаць тыя, што ёсць. Словам, урадам ёсць над чым працаваць. Было б нядрэнна, каб і адкладзены з-за пандэміі візіт Прэзідэнта Казахстана ў Беларусь адбыўся. Гэта быў бы добры штуршок для далейшага развіцця нашых адносін», — упэўнены Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт спадзяецца, што дзякуючы кіраўніку дыпведамства змогуць зрабіць яшчэ шмат для развіцця адносін дзвюх краін.

«Я хачу сказаць: калі нам не атрымліваецца нешта з расіянамі вырашыць і дамовіцца, мы заўсёды кааперавaліся з Казахстанам і дамаўляліся, — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка. — Я разлічваю, што мы яшчэ шмат зробім для дабрабыту нашых народаў».

**Марыя ДАДАЛКА.**

### ❍ У тэму

Як адзначыў Аскар Бейсенбаеў, афіцыйны візіт Прэзідэнта Казахстана ў Беларусь Касым-Жамарта Такаева ў 2019 годзе стаў значным імпульсам для павелічэння тавараабароту дзяржаў.

«У 2019 годзе тавараабарот упершыню разам з паслугамі перавысіў мільярд долараў і склаў 1,2 мільярда. На жаль, у 2020 годзе пандэмія ўнесла свае карэктывы, але супрацоўніцтва паміж дзвюма дзяржавамі ідзе актыўна. Аляксандр Рыгоравіч казаў, што неабходна весці паглыбленае супрацоўніцтва ў прамысловай кааперацыі, развіваць адносіны ў аграпрамысловым комплексе, будіндустрыі», — паведаміў пасол.

Ён выказаў словы ўдзячнасці авіякампаніі «Белавія», якая дапамагала казахстанцам па ўсім свеце падчас закрыцця граніц праз Мінск дабірацца на радзіму.

Садзейнічалі Казахстану, як расказаў пасол, і беларускія вытворцы панэляў і дзвярэй. Яны абсталёўвалі шпіталі для хворых на ковід, якія будаваліся ў Нур-Султане, Алма-Аты і Шымкенце.

Аскар Бейсенбаеў дадаў: афіцыйны візіт кіраўніка Казахстана, пра які нагадаў Прэзідэнт Беларусі, абавязкова адбудзецца.

«Гэтае пытанне будзе яшчэ ўдакладняцца. Я хацеў бы адзначыць, што гэты год юбілейны — 30-годдзе СНД. Беларусь сёлета — старшыня ў СНД. Мяркую, што ў гэтым годзе кіраўнікі краін сустрэнуцца», — выказаў думку пасол.

## Ва ўрадзе

# УРАД ВЫПРАЦАВАЎ МЕРЫ ПАДТРЫМКІ «БЕЛАРУСЬФІЛЬМА»

## Прэм'ер-міністр Раман ГАЛОЎЧАНКА наведаў Нацыянальную кінастудыю

**У прадпрыемства назапасіліся праблемы, якія абвастрыліся з-за пандэміі. Мадэль дзяржпадтрымкі кінавытворчасці не дазваляе працаваць на перспектыву, забяспечваць цыклічнасць выхаду фільмаў, уступаць у доўгатэрміновыя пагадненні і планаваць сумесныя фільмы з замежнымі партнёрамі. Абмеркаваць, як вярнуць былы гонар айчыннай кінастудыі, прыехаў прэм'ер.**

Асноўныя пытанні, на якія шукалі адказы падчас нарады, агучыў і **генеральны дырэктар Уладзімір КАРАЧЭЎСКІ:** якія задачы, мэты ў нацыянальнай кінастудыі, як працаваць з маладымі рэжысёрамі, якім чынам прадстаўляць кінастудыю на міжнародным рынку.

«Мы кажам не проста пра асобныя фільмы, а прэзентацыю магчымасці здымак у краіне. Гэта будзе садзейнічаць не толькі зарobку грошай, але і прыходу інвестараў, магчымасці працаваць па прадукцыі. Пры ўсіх плюсах нас вельмі мала ведаюць. Ведаюць асобныя праекты, але нам неабходна больш інтэнсіўна сябе пазіцыяніраваць на сусветным рынку», — сказаў кіраўнік кінастудыі.

Па яго словах, вытворчыя магутнасці «Беларусьфільма» задзейнічаны не ў поўным аб'ёме. Кінастудыя можа аказваць шырокі спектр паслуг: ад стварэння касцюма да постпрадакшну.

«Мы можам усё, але ў нас невялікія бюджэтныя рэсурсы на стварэнне кіно ў краіне, невялікі медыя і рэкламны рынак. Таму неабходна рабіць усё, каб працаваць са знешнімі заказчыкамі. Лакдаўны вельмі моцна адбіліся на фінансавай сітуацыі», — растлумачыў Уладзімір Карачэўскі, чаму студыя звяртаецца па дзяржпадтрымку.

Ён дадаў, што «Беларусьфільм» выконвае і сацыяльную ролю, бо здымаюць не толькі камерцыйнае, але і іміджавае для краіны кіно.

Уладзімір Карачэўскі сцвярджае, што аптымальнай формулай суаднясення сацыяльнага і камерцыйнага кіно з'яўляецца 40/60. Пры гэтым імкнуцца перабудоўваць работу пад бізнес. «Ёсць заказ, грошы, мы набралі на праект людзей, заплацілі за работу. Мяркую, у нас будзе штат кінафабрыкі пад забеспячэнне сваёй вытворчасці і аказання паслуг. За апошнія два гады мы пры падтрымцы дзяржавы змаглі закупіць абсталяванне на рэстаўрацыю, для работы анімацыйнай студыі, святлоасвятляльнай студыі. Таму мы можам выконваць патрабаванні сучасных заказчыкаў», — канстатаваў генеральны дырэктар.

Прэм'ер-міністра азнаёмілі з вытворчай базай кінастудыі. Ён наведаў здымачныя павільёны, склад ваеннага адзення, стрэльбавую залу, памяшканні запісу гуку. Пасля на нарадзе кіраўніцтва Саўміна прадстаўнікі кінаіндустрыі абмеркавалі прапановы ўрада па механізме дзяржпадтрымкі і развіцці кінематаграфіі.

Па словах Рамана Галоўчанкі, дзяржпадтрымка галіне аказвалася пастаянна па рашэнні кіраўніка дзяржавы. Ён нагадаў, што на кінавытворчасць выдаткавалі 29 мільёнаў рублёў бюджэтных грошай.

«Нядаўна кіраўніком краіны чарговы раз была прынята прапанова па далейшай падтрымцы кінастудыі, якая аказалася ў няпростым становішчы з-за пандэміі. Паменшыліся даходы ад экспартнай дзейнасці. Нягледзячы на тое, што вы людзі творчыя, патрабаванні і да Міністэрства культуры, і да кінастудыі будуць напружанымі і жорсткімі», — адзначыў прэм'ер-міністр.

Ужо ў размове з журналістамі Раман Галоўчанка дадаў, што экспартныя паслугі, якія зменшыліся з-за пандэміі, давалі значную падтрымку кінастудыі.

«Гэтае пытанне разглядалася яшчэ да сённяшняй нарады. Урадам выпрацаваны меры падтрымкі ў няпросты перыяд. Яны датычацца прадастаўлення зваротных фінансавых рэсурсаў для бягучай дзейнасці і меры дзяржаўнай падтрымкі па субсідзіраванні вытворчасці нацыянальных фільмаў. На завяршальнай стадыі — праекты адпаведных прававых актаў», — канстатаваў прэм'ер.

На нарадзе ўдзялілі ўвагу пытанню, як гэтыя меры кінастудыя выкарыстае, каб выйсці на прыбытковасць.

«Мы размаўлялі і пра запатрабаванасць тэматык у сучасната гледача, якія фільмы здымаць, якім павінен быць нацыянальны кінематаграфічны праект», — падкрэсліў Раман Галоўчанка.

Ён рэзюмаваў, што сёння «Беларусьфільм» укамплектаваны абсталяваннем, якое дазваляе здымаць якасны прадукт. Гэтага і чакаюць ад кінастудыі.

**Марыя ДАДАЛКА.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне намесніку старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па жыллёвай палітыцы і будаўніцтве Аляксандру Сяргеевічу Бабаловічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю БРАТА.**

Блізкая ўлада

# АДКРЫТЫ ДЫЯЛОГ З МОЛАДДЗЮ

## Наталля КАЧАНАВА сустрэлася са сталічнымі школьнікамі

**У межах інфармацыйна-адукацыйнага праекта «ШАГ» — «Школа актыўнага грамадзяніна» — адбылася сустрэча старшыні Савета Рэспублікі з навучэнцамі 9—11 класаў гімназіі № 24 Мінска.**

Як акрэсліла фармат сустрэчы сама Наталля Качанава, гэта своеасаблівая дыялогавая пляцоўка, на якой павінна адбыцца адкрытая гутарка.

Яна расказала дзецям аб сутнасці дзейнасці Канстытуцыйнай камісіі, у склад якой яна ўваходзіць, аб рабоце сенатараў над законапраектамі, якія датычацца недапушчальнасці геразацыі нацызму, змен у закон аб СМІ, аб масавых мерапрыемствах і іншых.

Спікер верхняй палаты парламента падкрэсліла, што работа з моладдзю — адзін з прыярытэтных кірункаў дзейнасці членаў Савета Рэспублікі, і анансавала сустрэчы ў межах інфармацыйна-адукацыйнага праекта «ШАГ» не толькі на пляцоўцы верхняй палаты парламента, але і ў сталічных школах.

Школьнікі цікавіліся як асабістымі пытаннямі (як спраўляецца са стрэсамі, што зараз чытае, як адчувае сябе жанчына ў вялікай палітыцы), так і тымі, якія датычацца агульнанацыянальнага характару (выхаванне моладзі і неабходнасці пашырэння адукацыі па патрыятычных кірунках, статусу беларускай мовы і інш.). Шчыра і адкрыта Наталля Качанава адказала на ўсе дзіцячыя — недзіцячыя — пытанні.

— Цудоўныя ўражанні ад гэтай сустрэчы, вельмі цікаўныя маладыя людзі, добрыя пытанні (агульначалавечыя, нармальныя, якія датычацца жыцця кожнага чалавека). Мне вельмі спадабалася, і я мяркую, што мы сталі сябрамі, гэта праўда, — падзялілася з журналістамі ўражаннямі ад гутаркі спікер Савета Рэспублікі.

Яна падкрэсліла, што тэмы падчас амаль двухгадзіннай гутаркі ўзнімаліся розныя.

— Натуральна, школьнікаў хвалюе іх асабістая будучыня (яны казалі аб патрыятызме, аб службе ў арміі) — гэта тыя пытанні, якія ў прынцыпе важныя для нашай краіны. Таму сказаць, што я натхнілася гэтай сустрэчай, — не сказаць нічога.

Наталля Качанава выказала меркаванне, што дыялог спадабаўся і маладым людзям, бо размова сапраўды атрымалася вельмі адкрытай і шчырай:

— Не было забароненых тэм (як ніколі і не бывае, калі мы сустракаемся з моладдзю), — падкрэсліла яна. — Таму такія сустрэчы ўзаемавыгадныя: яны падсілкоўваюць нас і, спадзяюся, цікавыя моладзі.

Старшыня Савета Рэспублікі акцэнтавала ўвагу на важнасці сустрэч з падрастаючым пакаленнем:

— Ты разумееш, наколькі важна сустрэць у жыцці дарослага чалавека, які б даў слушную параду, калі адна сустрэча змяняе тваё жыццё вельмі крута.

А напрыканцы Наталля Качанава пажадала ўсім маладым людзям здароўя і рэалізацыі іх планаў.

— Я заўсёды кажу: любіце нашу краіну — гэта вельмі важна! — падкрэсліла яна. — Будзеце любіць нашу краіну — мы будзем упэўнены ў тым, што яна застанецца такой цудоўнай, чыстай, светлай, прыгожай. Таму што мы хацелі б, каб, перадаўшы эстафету ім (беларускай моладзі. — **«Зв».**), яны яе з гонарам пранеслі, робячы ўсё на карысць нашага народа і роднай краіны.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

# Не толькі надзённыя, а і глабальныя пытанні

**Пытанні электрыфікацыі дачных дамоў, стан дарог, транспартныя зносіны вёсак з абласным цэнтрам — з такімі пытаннямі на прыём да памочніка Прэзідэнта — інспектара па Магілёўскай вобласці Леаніда МАРТЫНЮКА звярнуліся жыхары Магілёва і Магілёўскай вобласці, паведаміла БелТА.**

Дзве жанчыны звярнуліся з пытаннем наконт падвядзення электрычнасці да іх садовага таварыства. Зямлю ад завода людзі атрымалі яшчэ ў 1993 годзе, ім паабяцалі, што ў будучыні тут правядуць усе інжынерныя сеткі. «І за столькі гадоў на нашых лецішчах не з'явілася электрычнасць. Пытанне з вадой мы вырашылі самастойна, а са святлом так не атрымліваецца. Мы гатовыя ўдзельнічаць у гэтай рабоце», — заўважылі заяўніцы. Як адзначыў Леанід Мартынюк, гэта пытанне патрабуе дэталёвага разгляду на некалькіх узроўнях, у тым ліку Міністэрства энергетыкі.

Жыхарка вёскі Старое Пашкава прыйшла з просьбай прывесці ў парадак дарогу ў населеным пункце — усяго 600 метраў. Яна вядзе да канчатковага прыпынačнага пункту грамадскага транспарту. І гэтая дарога — адзіная сувязь населенага пункта з горадам. Жанчына расказала, што ў дрэннае надвор'е там немагчыма хадзіць: глiністая зямля ператвараецца ў глейкі бруд. Жыхары Старога Пашкава звярталіся да дарожнікаў, аднак яны сказалі, што дарога не ўключана ў сетку мясцовых дарог, таму яе не абслугоўваюць. Леанід Мартынюк зазначыў, што асабіста паглядзіць стан дарогі і паспрабуе дапамагчы ў вырашэнні праблемы.

Дзве жыхаркі вёскі Севасцьянавічы прыйшлі з праблемай яе транспартных зносін з горадам. Гэты населены пункт знаходзіцца недалёка ад абласнога цэнтра — усяго за 10 км. «Раней у нашу вёску двойчы ў дзень заязджаў рэйсавы аўтобус, які ідзе на Вялікія Бялевічы. А пасля таго, як з'явілася маршрутнае таксі, якое стала ездзіць па гэтых жа маршрутах, аўтобус пачаў хадзіць пусты, яго расклад адкарэкціравалі, і ён стаў нязручны для жыхароў нашай вёскі», — распавялі жанчыны. «У вырашэнні пытання з грамадскім транспартам важна ўлічваць меркаванне жыхароў усіх найбліжэйшых населеных пунктаў, — падкрэсліў памочнік Прэзідэнта. — Таму мы вывучым сітуацыю з грамадскім транспартам і паглядзім, чым можам дапамагчы».

— Важна, што на такіх прыёмах людзі ўзнімаюць праблемы не толькі добраўпарадкавання, якія звычайна іх хвалююць, але яшчэ і глабальныя пытанні, якія патрабуюць значных змен у заканадаўстве і над якімі прыйдзецца працаваць нават не адзін месяц. У прыватнасці, было ўзнята пытанне аб электрыфікацыі дачных участкаў. Безумоўна, ёсць прарэхі ў заканадаўстве, якое неабходна мяняць і ў рамках заканадаўчага поля знаходзіць кансэнсус, зручны для жыхароў, — падкрэсліў Леанід Мартынюк. — Асабісты прыём заўсёды важны, бо гэта жывыя зносіны. Часам людзі прыходзяць не толькі выказацца, падзяліцца сваім нейкім набалелым пытаннем і знайсці яго вырашэнне, але і проста пагаварыць, падзякаваць мясцовым уладам за работу».

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У Мексіцы з-за пандэміі закрылася звыш мільёна кампаній



Эканамічныя наступствы пандэміі каранавіруса прымусілі больш за 1 млн прадпрыемстваў малога і сярэдняга бізнесу ў Мексіцы спыніць дзейнасць. Такія даныя ўтрымліваюцца ў афіцыйным дакладзе Нацыянальнага інстытута статыстыкі і геаграфіі, паведаміла ТАСС. Летась абвал аб'ёму валавога нацыянальнага прадукту краіны з-за наступстваў пандэміі склаў 8,5 працэнта, стаўшы самым маштабным з 1931 года. Паводле прагнозаў Банка Мексікі, сёлета нацыянальная эканоміка можа вырасці на 4,8 працэнта, а ў 2022 годзе — на 3,3 %. Як паведамляе Міністэрства аховы здароўя Мексікі, з канца лютага мінулага года COVID-19 заразілася каля 2,4 мільёна жыхароў краіны. Памерла звыш 198 тысяч інфіцыраваных пацыентаў.

### Аўстралійцам пагражае нашэсце смяротна небяспечных павукоў



Улады папярэдзілі жыхароў Новага Паўднёвага Уэльса (Аўстралія) аб магчымым нашэсці аднаго з найбольш небяспечных у свеце павукоў — сіднэйскага варонкавага, паведаміў тэлеканал 9News. Апошняе можа адбыцца з-за цёплага надвор'я і праліўных дажджоў, якія выклікалі паводкі па ўсім штаце. На гэтым тыдні ў інтэрнэце і сацыяльных сетках былі размешчаны відэаролікі і фотаздымкі, на якіх паказаны тысячы павукоў, што ратуюцца ад паводкі. Эксперты лічаць, што цёплае надвор'е і высокі ўзровень вільготнасці ствараць ідэальныя ўмовы для павукоў у найбліжэйшыя дні. Аўстралійскі парк рэптылій выпусціў папярэджанне, якое заклікае людзей быць пільнымі, уважліва аглядаць свой абутак, пасцельныя рэчы і адзенне.

### Сейшэлы адкрыліся для турыстаў



Улады Сейшэльскіх астравоў адкрылі граніцы для замежных турыстаў, зняты каранцін і адменена патрабаванне вакцынных сертыфікатаў. Як адзначыў міністр замежных спраў і турызму Сейшэлаў Сільвестр Радэгондзэ, пры новым рэжыме ўезду захоўваецца толькі патрабаванне аб ПЛР-тэсце на каранавірус перад паездкай. Яго трэба зрабіць у сертыфікаванай лабараторыі не раней чым за 72 гадзіны да прылёту. Акрамя таго, турысты павінны падаць заяву для атрымання абавязковага медыцынскага дазволу да Дэпартамента аховы здароўя Сейшэлаў. Як адзначала раней галоўны сакратар па турызме Ан Лафарцюн, турысты могуць браніраваць размяшчэнне ў любым з 538 сертыфікаваных атэляў, а таксама выконваць сацыяльнае дыстанцыяванне і масачны рэжым.

## ПАГАВАРЫЦЬ З ГУБЕРНАТАРАМ

Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.

**Тэлефонныя лініі ў суботу, 27 сакавіка, з 9.00 да 12.00 правядуць:**

- старшыня Брэсцкага аблвыканкама Юрый Вітольдавіч ШУЛЕЙКА. Тэл. 8 016 221 31 21;
- старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай Мікалаевіч ШАРСНЁЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;
- першы намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Ігар Мікалаевіч ЧАСНОК. Тэл. 8 023 233 12 37;
- намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Іосіфавіч ДЗЯШКО. Тэл. 8 015 273 56 44;
- кіраўнік спраў Магілёўскага аблвыканкама Мікалай Леанідавіч ДЗЯДКОЎ. Тэл. 8 022 250 18 69;
- намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Аляксандр Уладзіміравіч КРУЧАНАЎ. Тэл. 8 017 500 41 60;
- намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Арцём Мікалаевіч ЦУРАН. Тэл. 8 017 222 44 44.

Надвор'е

# Вясна прыйшла сапраўдная, цяпер і метэаралагічная

## У суботу — да плюс 15, а ў аўторак — наогул да 17 цяпла

**Сапраўдная метэаралагічная вясна надыходзіць у той час, калі сярэднесутачныя тэмпературы ўстойліва трымаюцца вышэй за нуль. Ужо больш за тры дні гаспадаром надвор'я ў нашай краіне з'яўляецца вобласць павышанага атмасфернага ціску. Ва ўмовах малавоблачнага надвор'я яркае сонца ўсё больш прагравае прыземнае паветра, а таму ўдзень устойліва цёпла. Да канца тыдня стане яшчэ цяплей, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Ясна і сонечна чакаецца ў суботу. У гэты дзень тэрыторыя краіны будзе знаходзіцца ў вобласці павышанага атмасфернага ціску, паветраная маса, якая паступае з Заходняй Еўропы, будзе яшчэ больш цёплай. Істотных ападкаў не чакаецца. Уначы і раніцай у нізінах і паблізу вадаёмаў — слабыя туманы. Вецер паўднёвы, паўднёва-ўсходні ад слабага да умеранага. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 2 градусаў да 5 цяпла. Удзень будзе плюс 8—15 градусаў.

Сітуацыю з цяплом злёгку сапсуе паўночны вецер у нядзелю. Справа ў тым, што на надвор'е ў Беларусі пачнуць дзейнічаць франтальныя падзелы ад скандынаўскага цыклону. Павялічыцца і ўшчыльніцца воблачнасць. Уначы месцамі, а ўдзень на большай частцы тэрыторыі пройдуць кароткачасовыя дажджы. У начны і ранішнія гадзіны дзе-нідзе могуць узнікаць слабыя туманы. Вецер умераны, месцамі парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да плюс 5 градусаў. Удзень будзе 4—11 цяпла.

Не зусім камфортна з надвор'ем будзе і ў панядзелак. Яго сфарміруе няўстойлівая ўмерана цёплая паветраная маса, якая паступае з Заходняй Еўропы. Месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя ападкі, у аснойным у выглядзе дажджу. Уначы і раніцай прагназуюцца слабыя туман і галалёд, на асобных участках дарог галалёдзіца. Вецер заходні, паўднёва-заходні слабы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад 3 марозу да плюс 4 градусаў. Удзень будзе 5—12 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у аўторак і сераду наша краіна апынецца пад уплывам атмасферных франтоў і вільготных няўстойлівых цёплых паветраных мас атлантычнага паходжання. У многіх рэгіёнах краіны пройдуць дажджы, а тэмпература паветра чакаецца ўначы ад 3 да 10 цяпла, у сярэдзіне дня — плюс 7—14 градусаў, па паўднёвым захадзе краіны — 15—17 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# «Лес — рэсурс, які мы павінны выкарыстоўваць рацыянальна»



Сасна займае каля 50 % у пароднай структуры лясоў.

***— Колькі людзей сёння рупіцца ў лясной гаспадарцы?***

— Амаль 39 тысяч чалавек. Толькі за апошні год колькасць працоўных кадраў у нас вырасла прыкладна на тысячу. Сярэдні ўзрост работнікаў — каля 40 гадоў. Лічу, што гэта аптымальны паказчык.

Мы праводзім актыўную работу па прыцягненні ў галіну маладых спецыялістаў і рабочых. Штогод у лясную гаспадарку прыходзіць каля 350 маладых спецыялістаў з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй.

Мы заўсёды нацэльваем кіраўнікоў падраздзяленняў быць канкурэнтнымі ў плане працоўных рэсурсаў, у прыярытэт ставіць матэрыяльны дабрабыт работнікаў, матываваць іх да павышэння заробку і расці ў прафесіі.

## ЛЯСНЫ БАЛАНС

***— Наколькі ўдаецца вытрымліваць баланс паміж выкарыстаннем лясных рэсурсаў і іх захаваннем?***

— У нашай краіне дастаткова развітая лясная навука, захаваны асноўныя прынцыпы вядзення лясной гаспадаркі. У аснову ўсяго мы ставім прынцып невычарпальнасці, закладзены ў Лясным кодэксе.

Мы не высякаем лес проста так, робім гэта ў адпаведнасці з лесаўпарадкавальным праектам, які распрацоўваецца для кожнага лягаса. Прафесійны, навуковы падыходы, планавасць — усё гэта дазваляе дабівацца пастаўленых мэт, у тым ліку павышэння лясістасці краіны. Сёння яна блізкая да аптымальнай і складае 40,1 %.

Паказальна, што з 2014 года лясоў у Беларусі ствараецца больш, чым высякаецца, да таго ж, з улікам стварэння новых лясоў на прынятых землях. Напрыклад, у 2014-м пры плошчы суцэльных высечак у 32 тысячы гектараў малады лес з'явіўся на 43,7 тысячы гектараў. У 2019-м, калі краіна перажывала ўсыханне хваёвых насаджэнняў, пры выкананых высечках на плошчы 51,2 тысячы гектараў дрэўцы з'явіліся на плошчы 51,8 тысячы гектараў. У 2020 годзе пры плошчы суцэльных высечак у 45,9 тысячы гектараў новыя лясы створаны на 46,7 тысячы гектараў. Так дзейнічае прынцып невычарпальнасці.

Я ўпэўнены: лес — нацыянальнае багацце толькі тады, калі яно прыносіць прыбытак. Але ёсць тая чырвоная лінія, за якую мы не павінны пераступаць: неабходна браць лесу менш, чым ствараем. І сёння мы гэтага прынцыпу прытрымліваемся: высякаем у 2,5—3,5 раза менш за штогадовы прырост. Нас у гэтым падыходзе падтрымліваюць вучоныя і эколагі.

З 1994 года доля спелых лясоў, якія з'яўляюцца асноўнай базай для нарыхтовак, павялічылася з 4,7 % да 14,7 %, а разліковая лесасека — з 5,4 млн м³ (1994 год) да 14,3 млн м³ (2020 год). Сёлета разліковая лесасека па высечках галоўнага карыстання складае 14,9 млн м³. Да 2025 года ўзровень лясістасці павінен павысіцца да 40,3 % у 2025 годзе, а аб'ём нарыхтоўкі драўніны з 1 гектара пакрытых лесам зямель — да 3,2 м³.

***— Наколькі аптымізаваны ўзроставы і пародны склад лясоў Беларусі?***

— Найбольш аптымальна, калі ўсе чатыры ўзроставыя групы лясоў — маладнякі, сярэднеўзроставыя, аспяваючыя і спелыя — маюць каля 25 % кожная. У нас маладнякі і спелыя лясы займаюць па 18 %, сярэднеўзроставыя — 26 %, а самы найбольшы паказчык у аспяваючых — 38 %.

Рэгуляваць узроставую структуру дапамагаюць суцэльныя высечкі, у тым ліку і тыя, што праводзяцца пры ўборцы пашкоджаных насаджэнняў, а таксама стварэнне лясных культур.

Што ж датычыцца пароднай структуры, то яна залежыць ад нашых прыродна-кліматычных умоў. Так, у складзе беларускіх лясоў павінна быць сасна (55 %), елка (11 %), дуб (6 %), бяроза (13 %), чорная алешына (9 %), асіна (1 %) і іншыя пароды (5 %). Сёння ж насаджэнні сасны складаюць усяго 49 %, елкі — 9 %, дубу — 4 %, бярозы — 23 %, чорнай алешыны — 9 %, асіны — 2 %, іншых парод — 4 %.



Спецыяльная тэхніка дапамагае лясгасам эфектыўна нарыхтоўваць лес і зменшыць рызыку траўміравання для работнікаў.

Зніжэнне сасны і елкі ў пароднай структуры звязана з працэсамі ўсыхання хваёвых дрэвастояў, якія адбываліся ў краіне на працягу апошніх дзесяці гадоў.

***— Наколькі атрымалася справіцца з гэтай праблемай?***

— У 2018 годзе каля паловы ад агульнага аб'ёму нарыхтоўкі склалі высечаныя хворыя лясы — гэта быў пік усыхання хваёвых насаджэнняў за ўсю гісторыю Беларусі. У 2019 і 2020 гадах гэты працэс пайшоў на спад. Агульная плошча насаджэнняў сасны і елкі, якая патрабавала правядзення суцэльных санітарных высечак, за 2020 год склала 18,3 тысячы гектараў (у 2018-м — 47,3 тыс. га). Сёлета работы па барацьбе са ствАловымі шкоднікамі працягнуцца, але аналіз паказвае, што аб'ёмы ўсыхання насаджэнняў не перавысяць узровень мінулага года.

***— Што робіцца для таго, каб зменшыць негатыўны ўплыў змены клімату і звязаных з гэтым працэсаў на лясную галіну?***

— Наша асноўная задача — каб лесу было больш, каб ён быў устойлівы. На гэта нацэлена і Стратэгія адаптацыі лясной гаспадаркі да змены клімату да 2050 года і іншыя дакументы. Мы бачым перспектыву ў стварэнні змешаных лясоў, на мацярынскай пародзе, з больш адаптаванага насення, якое атрымліваем на сваіх лесанасенных плантацыях.

***— Сёння ў Беларусі шмат вырошчваюць пасадачнага матэрыялу з закрытай каранёвай сістэмай...***

— Так, у мінулым годзе з выкарыстаннем пасадачнага матэрыялу з закрытай каранёвай сістэмай створана каля 6,3 тысячы гектараў лясных культур, ці 16,1 % ад агульнай плошчы пасеву і пасадкі лесу. Да 2025 года штогадовая плошча іх стварэння перавысіць 6,5 тысячы гектараў.

Для вырошчвання пасадачанага матэрыялу з закрытай каранёвай сістэмай пабудаваны спецыялізаваныя цяплічныя комплексы ў Глыбоцкім доследным, Івацэвіцкім і Магілёўскім лясгасах, а таксама на базе Рэспубліканскага лясного селекцыйна-насенняводчага цэнтра. Вырошчваюць яго і ў пастаянных лясных гадавальніках лясгасаў. У 2020 годзе аб'ём вырошчвання склаў 21,4 мільёна штук. Плануецца, што паказчык вырасце да 25 мільёнаў раслін у год, што поўнасцю забяспечыць патрэбы лясной гаспадаркі ў гэтым відзе прадукцыі.

## З СЫРАВІННАЙ КРАІНЫ — У ПЕРАПРАЦОЎЧУЮ

***— Якія змены адбыліся ў сферы лесанарыхтоўкі і дрэваапрацоўкі?***

— Як і ва ўсім свеце, мы разумеем, што ў лесанарыхтоўцы неабходна ўсё больш выкарыстоўваць машынныя механізмы. Гэта мінімізуе траўматызм, а таксама ўздзеянне фактараў надвор'я на работнікаў лесу.

Акрамя таго, развіваем сферу паслуг у лесанарыхтоўцы. Сёння больш за 30 % драўніны нарыхтоўваецца на паслугах — пабочнымі лесарубамі. Такім чынам, лясгасы забяспечваюць занятасцю не толькі свае калектывы, але і садзейнічаюць развіццю прыватнага бізнесу на тэрыторыі малых і сярэдніх населеных пунктаў рэспублікі. Але яшчэ ёсць куды расці. Лічба, якую мы бачым перад сабой, — нарыхтоўваць уласнымі сіламі менш за 50 % драўніны. Гэта было б аптымальным варыянтам. Наша ж тэхніка павінна быць настроена на пікавыя нагрузкі, калі адбываюцца буралômы, масавыя ўсыханні.

Калі казаць пра дрэваапрацоўку, то работа нашых прадпрыемстваў засяроджана ў асноўным на перапрацоўцы незапатрабаваных аб'ёмаў нізкаякаснай драўніны (ад усыхання, мяккалістаых парод). Гэты рэсурс не карыстаецца папулярнасцю ў буйных перапрацоўшчыкаў, але прыносіць немалы прыбытак. У мінулым годзе прадпрыемствы Мінлясгаса перапрацавалі самыя вялікія аб'ёмы драўніны — каля 6 млн м³, пры гэтым доля нізкаякаснай драўніны склала больш за 50 %.

Лесагаспадарчыя ўстановы сёння вырашаюць не толькі камерцыйныя пытанні, але і нясуць пэўную сацыяльную нагрузку. Наяўнасць дрэваапрацоўчых вытворчасцяў садзейнічае занятасці ў сельскай мясцовасці, забеспячэнню матэрыяламі насельніцтва.

Мы разумеем сваю асноўную ролю — даваць неабходную сыравіну перапрацоўшчыкам драўніны ўнутры краіны. Нашы ж вытворчасці забяспечваюцца па астаткавым прынцыпе. Але калі яны дзейнічаюць, то справа гонару, каб яны былі безадходнымі і бясстратнымі. Так, вырашаючы гэтыя дзве задачы, мы і рухаемся.

Фактычна за некалькі дзесяцігоддзяў мы змаглі выйсці на поўную акупнасць і не пусціць пры гэтым «пад нож» увесь рэсурс. Дзякуючы эфектыўнай дзяржаўнай палітыцы, мы ператварыліся з сыравіннай краіны ў перапрацоўчую.

***— У чым вы бачыце перспектыву дзейнасці пелетных заводаў?***

— Летась мы запусцілі сем новых заводаў агульнай гадавой прадукцыйнасцю 171 тысячу тон пелет. Плануецца штогод атрымліваць каля 25 млн долараў выручкі з гэтых вытворчасцяў. За кошт іх стварэння мы вырашаем пытанне па перапрацоўцы дрывяной драўніны, якая яшчэ ўчора фактычна ляжала ў лесе і была незапатрабаваная. Дарэчы, у стадыі будаўніцтва знаходзяцца яшчэ шэсць праектаў.

Сёння паліўныя гранулы — экспартаарыентаваны від прадукцыі. Да канца года ў нашых прадпрыемстваў ужо поўнасцю сфарміраваны партфель заказаў.

Разам з тым важна выкарыстоўваць гэта паліва ўнутры краіны. Лічу, не зусім правільна, калі мы імпартуем для нашых кацельняў прыродны газ, а сваё паліва прадаём у Польшчу ці Прыбалтыку. Таму, калі я дакладваў кіраўніку дзяржавы, ён падтрымаў прапанову вярнуцца да праграмы пераходу на мясцовыя віды паліва, у тым ліку паліўныя гранулы. Гаворка ідзе пра некаторыя лакальныя кацельні, напрыклад, у невялікіх населеных пунктах, куды немэтазгодна весці магутныя электрычныя сеткі для ацяплення.

Ужо адбылася першая рабочая сустрэча Мінлясгаса, Мінэнерга, Мінжылкамгаса на гэтую тэму. Упэўнены, што пры належным падыходзе з боку ўсіх зацікаўленых за паліўнымі грануламі — будучыня.

***— Міністэрства лясной гаспадаркі даўно працуе па прыцягненні грамадскасці да пытанняў захавання і прымнажэння лясоў. Акцыі «Тыдзень лесу» і «Чысты лес» сталі візіткай ведамства...***

— Традыцыйна вясной на Тыдні лесу мы ствараем лясныя культуры, восенню падчас «Чыстага лесу» займаемся добраўпарадкаваннем і наводзім парадак у лясным фондзе. Сёлета Тыдзень лесу пройдзе з 3 па 10 красавіка — чатырнаццаты раз. Гэта лічба кажа сама за сябе: калі акцыя існуе так доўга, значыць, на яе ёсць запыт у грамадстве.

Наша асноўная мэта правядзення такіх акцый — не столькі дапамога насельніцтва ў пасадцы лесу ці яго ўборцы. Калі чалавек хоць раз у жыцці прыме ўдзел у гэтых акцыях, то ўжо ніколі не будзе смецiць, ламаць дрэвы. Папрацаваўшы хоць бы адну гадзіну ў лесе, людзі разумеюць, наколькі нялёгкая такая праца. Мы бачым станоўчыя змены.

Акрамя таго, падчас гэтых акцый праходзяць тэматычныя лекцыі: мы знаёмім людзей са сваёй працай, расказваем, як клапоцімся пра лясы, ствараем новыя.

***— Яшчэ адна тэма, якая звязана са стаўленнем грамадства да лесу, — гэта пажары.***

— Так, ёсць асобныя катэгорыя грамадзян, якія ўчыняюць такія злачынствы. Але ёсць і такія (і я хачу ім падзякаваць), якія аператыўна паведамляюць нам пра ўзгаранні ў лесе і нават дапамагаюць тушыць.

Мы кожны год рыхтуемся да пажаранебяспечнага перыяду: ствараюцца і даглядаюцца мінералізаваныя палосы і супрацьпажарныя разрывы, закупляецца абсталяванне. У лясгасах існуюць пажаранaзіральныя вышкі, сістэмы відэаназірання, укараняюцца аўтаматызываныя дыстанцыйныя сістэмы ранняга выяўлення ўзгаранняў.

Дапамагае таксама і практыка ўвядзення забарон і абмежаванняў на наведванне лясоў. На жаль, не ўсе грамадзяне разумеюць неабходнасць такіх дзеянняў — для некаторых пікнік у сухім лесе больш важны за бяспеку. Каб растлумачваць важнасць гэтых мер, мы актыўна працуем як у лесе, так і ў сацсетках, тэлеграме. На сайце міністэрства створана аператыўная карта забарон і абмежаванняў на наведванне лясоў у раёнах Рэспублікі Беларусь.

**Вераніка КОЛАСАВА.**
**Фота аўтара.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Лясныя пажары часта адбываюцца па віне чалавека.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Ініцыятывы маладых

# Каманда будучыні

**У Мінску праходзіць І Беларускі маладзёжны парламенцкі форум. На працягу двух дзён з 25 да 26 сакавіка ён аб'яднаў маладых палітыкаў, прадстаўнікоў органаў маладзёжнага парламентарызму, грамадскіх рухаў і арганізацый.**

Учора ў Мінскім гарадскім адукацыйна-аздараўленчым цэнтры «Лідар» у рамках адукацыйнай праграмы кампетэнтныя спецыялісты правялі для моладзі лекцыі па такіх тэмах, як аратарскае майстэрства, асабісты брэнд, прасоўванне ў сацыяльных сетках, палітычная рыторыка — усё тое, што павінен умець і чым павінен валодаць малады парламентарый. Сёння для маладых людзей прадоўжацца мерапрыемствы, сярод іх — сустрэча з кіраўніцтвам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу і экскурсія па Палацы Незалежнасці. У ходзе правядзення форуму таксама адбудзецца фінал нацыянальнага конкурсу «Каманда будучыні» ў намінацыі «Палітыка», які завершыцца ўзнагароджаннем пераможцаў.

Гаворачы аб задачах І Беларускага маладзёжнага парламенцкага форуму, **старшыня пастаяннай камісіі Маладзёжнага парламента па інфармацыйнай палітыцы, тэхналогіях і сувязях з грамадскасцю Анастасія ЦАЛЮК** патлумачыла:

— Асноўная мэта — аб'яднаць маладых палітыкаў, прадстаўнікоў органаў маладзёжнага парламентарызму, грамадскіх рухаў і арганізацый і выявіць найлепшых з іх для далейшай работы. Удзельнікамі форуму сталі каля ста маладых людзей ва ўзросце ад 18 да 31 года, якія маюць досвед грамадскай дзейнасці не менш як год. Нацыянальны праект «Каманда будучыні» — гэта кадравы конкурс, задачай якога з'яўляецца пошук, развіццё і падтрымка перспектыўных лідараў. Для паспяховага ўдзелу ў ім маладому чалавеку трэба валодаць пэўнымі якасцямі: перш за ўсё быць ініцыятыўным, крэатыўным, мець некаторыя кіраўніцкія навыкі, быць лідарам, які не баіцца заявіць пра сябе, прэзентаваць сваю ініцыятыву, якую можна ў далейшым рэалізаваць і выкарыстоўваць у розных галінах. Конкурс прадугледжвае фарміраванне ва ўдзельнікаў кампетэнцый у сферы кіравання, у тым ліку праз праходжанне навучання, стварэнне камунікацыйнай пляцоўкі для абмену вопытам паміж удзельнікамі, садзейнічання іх развіццю і распаўсюджванню найлепшых ідэй. Першы этап «Каманды будучыні» накіраваны на выяўленне маладзёжных лідараў у галіне палітыкі. Пераможцы змогуць стаць на час дублёрамі першых асоб дзяржавы, правесці з імі пэўны час, паспрабаваць свае сілы ў гэтай сферы. У будучыні плануем правесці такія этапы і выявіць маладзёжных лідараў у галіне культуры, прамысловасці, энергетыкі. Бо галоўная задача Маладзёжнага парламента пры Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь — даць магчымасць маладым людзям заявіць пра сябе і праявіць свой патэнцыял па максімуме.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

# Пачаўся выпуск прамысловых партый «Спадарожнік V»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Першая партыя складзе да 100 тысяч доз. Далейшы аб'ём выпуску — да 500 тысяч доз прэпарату штомесяц. Вакцына будзе даступная ўсяму насельніцтву. Для грамадзян Беларусі вакцынацыя бясплатная.

Нагадаем, што работа па арганізацыі выпуску вакцыны на «Белмедпрэпаратах» была няпростая: яна вялася ў сціслыя тэрміны і пры адсутнасці прамых выездаў спецыялістаў за мяжу. Пры гэтым расійскія партнёры падкрэслівалі, што Беларусі ўдалося наладзіць вытворчасць дзякуючы развітой фармпрамысловасці.

Вакцына «Спадарожнік V» валодае эфектыўнасцю вышэй за 90 % і забяспечвае поўную засцярогу ад цяжкіх выпадкаў заражэння каранавірусам. Ёй вакцынавана ўжо больш за 1,5 мільёна чалавек. Вакцына падыходзіць для людзей, старэйшых за 60 гадоў. Яна адобрана ў Расіі, Беларусі, Сербіі, Аргенціне, Балівіі, Алжыры, Палесціне, Венесуэле, Парагваі, Туркменістане, Венгрыі, ААЭ, Іране, Гвінеі, Тунісе і Арменіі. Беларусь стала першай краінай пасля Расіі, дзе «Спадарожнік V» афіцыйна зарэгістравалі (рэгістрацыйнае пасведчанне было выдадзена 21 снежня 2020 года). З кастрычніка мінулага года ішлі першыя замежныя клінічныя даследаванні, а першая партыя прэпарату была пастаўлена ў Беларусь у канцы снежня 2020 года.

Даступная ў нашай краіне не толькі расійская вакцына. У рэгіёны даставілі і партыі кітайскай вакцыны. Як паведамляе Брэсцкі абласны цэнтр гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя, у вобласць паступіла 10 496 доз вакцыны вытворчасці КНР. Яна будзе прымяняцца для вакцынацыі работнікаў устаноў адукацыі, сацыяльнага абслугоўвання і тых, якія пражываюць ва ўстановах з кругласутачным рэжымам знаходжання. Гэта вакцына інактываваная, яна можа выкарыстоўвацца для вакцынацыі людзей ва ўзросце ад 18 гадоў і старэйшых.

Імунізацыя праходзіць у два этапы з інтэрвалам у 21—28 дзён паміж прышчэпкамі. Адзначаецца, што перахварэлыя на каранавірус могуць прайсці вакцынацыю праз 3—6 месяцаў пасля хваробы. Імунітэт пасля прышчэпкі пачынае фарміравацца не адразу. Найбольш поўная ахова фарміруецца праз тры тыдні пасля ўвядзення другой дозы. Перад прышчэпкай абавязкова праводзіцца медыцынскі агляд.

Усе ахвотныя прышчапіцца ад каранавіруса могуць звяртацца ў паліклінікі па месцы жыхарства для папярэдняга запісу.

**Алена КРАВЕЦ.**

Шляхі вырашэння

# З МАРКАЙ ЯКАСЦІ І СТЫЛЮ

## Пра новыя падыходы ў будаўніцтве гаварылі ў Брэсце на семінары-нарадзе

**На семінары-нарадзе па пытаннях павышэння эфектыўнасці будаўнічага комплексу вобласці разгледжана шырокае кола пытанняў, якія датычацца ўзвядзення жылля і аб'ектаў сацкультбыту. Семінар пачалі на будаўнічых пляцоўках новых мікрараёнаў і кварталаў забудовы, каб зверыць тэорыю з практыкай, вызначыць найбольш праблемныя пытанні і накрэсліць шляхі іх вырашэння.**

### Медцэнтр і «Малінаўка»

Удзельнікі форуму наведалі пляцоўку медыцынскага комплексу, які зараз узводзіцца ў «Паўднёва-Заходнім мікрараёне-5». Цяпер тут манціруецца дах, пракладваюцца інжынерныя сеткі, устанаўліваюцца ліфты, пачынаецца адстройванне памяшканняў. Каштарысны кошт аб'екта — 51 мільён рублёў, з якіх 15 млн закладзены на абсталяванне. У цэнтры размесцяцца дарослая і дзіцячая паліклінікі на 500 і 600 наведванняў у змену адпаведна, а таксама жаночая кансультацыя, разлічаная на 190 прыёмаў на дзень. Генпадрадчык аб'екта — СПМК-2 Брэстаблсельбуда — замест 38 месяцаў, паводле плана, узялася ўзвесці комплекс за два гады. Увод у строй чакаецца ўжо ў снежні.

Наступным адрасам наведвання стаў жылы комплекс «Малінаўка», які літаральна на вачах вырастае па вуліцы Суворава. Прыватны інвестар-забудоўшчык ТАА «Белпрок Буд Груп» прадэманстраваў індывідуальны падыход да праектавання. Гэты жылы квартал па тыпах дамоў, якасці будаўнічых матэрыялаў, асяродку пражывання і добраўпарадкаванні не мае сабе роўных у горадзе. «Малінаўка» ўяўляе сабой дзесяць шматкватэрных дамоў ад трох да пяці паверхаў, 40 таўнхаўсаў і два індывідуальныя жылыя дамы, якія аб'яднаныя адзінай архітэктурнай канцэпцыяй. Гэта своеасаблівы адказ тым шматлікім прыгарадным пасёлкам, што выраслі за апошнія дзесяцігоддзі, чыё архітэктурнае аблічча можна праілюстраваць хіба прыказкай: «Хто ў плот, а хто ў агарод». Адзіны стыль па вызначэнні нясе ў сабе пэўную стыльнасць. Акрамя таго, новы раён вызначаецца зручнасцю: паралельна з дамамі ствараецца інфраструктура жылога раёна — дзіцячыя і спартыўныя пляцоўкі, зоны адпачынку, убудаваныя міні-дзіцячыя садкі. Першую чаргу «Малінаўкі» ўжо пачынаюць абжываць навасельцы. І ў іх няма асаблівых нараканняў на будаўнікоў.

### Камп'ютарнае дрэва ці жывое?

Чаго, відаць, не скажаш пра квартал забудовы шматпавярховікаў у суседнім раёне. Сёлета ў вобласці плануецца ўвесці ў эксплуатацыю 81 шматкватэрны дом. 27 з іх ужо ўзводзяцца ў абласным цэнтры. **Намеснік старшыні Брэсцкага гарвыканкама Мікалай ЯКУБОЎСКІ** пазнаёміў удзельнікаў семінара з карцінай забудовы каля спецыяльнага стэнда, асаблівы акцэнт зрабіў на будаўніцтва дамоў у згаданым Паўднёва-Заходнім мікрараёне:

— ПЗМР-5, размешчаны паміж вуліцай Ковельскай і паркам тысячагоддзя Брэста, становіцца па сутнасці брамай у краіну з боку Еўрасаюза (побач пагранпераход «Варшаўскі мост» — **Аўт.**). Нездарма тут узводзяцца дамы сапраўды еўрапейскага класа — са стыльнымі фасадамі, пад'езды зашкляюцца да падлогі, абсталяваны паркоўкі для ровараў. Ажыццяўляецца канцэпцыя: двары без машын. Паркоўкі для аўтатранспарту выносяцца за дваровыя тэрыторыі, а ў дварах прадугледжана азеляненне, дзіцячыя гульнявыя зоны.

На праблему азелянення асаблівую ўвагу звярнуў **старшыня аблвыканкама Юрый ШУЛЕЙКА**, які браў удзел у рабоце семінара і, сярод іншага, пакрытыкаваў будаўнікоў:

— На камп'ютары вы намалявалі прыгожую зялёную зону, а як яе зрабіць такой у двары? — спытаў губернатар. — Праз колькі гадоў можна будзе пасядзець у цяньку гэтых дрэў, калі іх уткнуць у зямлю саджанцамі? Пры будаўніцтве трэба адразу садзіць дарослыя дрэвы. Тэхналогіі такія ёсць. Зялёныя зоны — гэта прыгожы горад. Яго трэба такім рабіць адразу, а не расцягваць на дзесяцігоддзі.


Квартал забудовы «Малінаўка».

На семінары зайшла гаворка і пра развіццё горада-спадарожніка Брэста — Жабінкі. Раней планавалася актыўна ўзводзіць жыллё для брастаўчан у найбліжэйшым райцэнтры, такім чынам прыцягнуць у Жабінку да 2020 года чатыры з паловай тысячы брастаўчан. Але жыхары абласнога цэнтра не выказваюць жаданне пераязджаць у раённы горад. Ёсць, праўда, чарга з ахвотных будаваць там індывідуальныя дамы. Значыць, перспектыўнай для горада-спадарожніка выглядае сядзібная забудова. А з будаўніцтвам шматпавярховага жылля давядзецца пачакаць. Магчыма, пытанне паўстане на парадку дня пазней.

### Зверка пазіцый

На пленарнай нарадзе ўдзельнікі семінара зверылі пазіцыі на падставе лічбаў і фактаў. Летась на Брэстчыне, як і ва ўсёй краіне, знізіўся аб'ём падрадных работ. Праўда, брэсцкія будаўнікі вызначыліся экспартам паслуг — ён склаў 60 мільёнаў рублёў, або крыху больш за 123 працэнты ад паказчыка папярэдняга года. Асабліва складаны выдаўся мінулы год, калі будаўнікі адчулі ўплыў росту цэн на шчэбень, бетон, арматуру, драўніну. Але пры ўсёй складанасці 2020-га Брэсцкая вобласць адзіная ў краіне забяспечыла рост падрадных работ за пяцігодку. Агульны аб'ём уводу жылля за кошт усіх крыніц склаў 3,26 мільёна квадратных метраў, або 108,5 працэнта ад задання. Больш уведзена ў эксплуатацыю толькі ў Мінску і Мінскай вобласці. А па аб'ёме будаўніцтва жылых памяшканняў для тых, хто мае патрэбу, з дзяржаўнай падтрымкай рэгіён займае лідзіруючыя пазіцыі ў краіне.

Сёлета для гэтай катэгорыі насельніцтва плануецца пабудаваць 200 тысяч квадратных метраў жылля, у тым ліку забяспечыць новым жыллём 1,4 тысячы шматдзетных сем'яў. Яшчэ для 1,7 тысячы такіх сем'яў маркуецца палепшыць жылёвыя ўмовы. У планах на першы квартал — здаць 158,7 тысячы квадратных метраў, што складае амаль 30 працэнтаў ад гадавога задання.

Асаблівая ўвага цяпер аддаецца якасці будаўнічых работ. У Брэсцкай вобласці функцыянуюць моцныя будаўнічыя арганізацыі са сваёй школай, з уласнымі традыцыямі. Таму і запрашаюць спецыялістаў у Маскву, Калінінград, іншыя рэгіёны Расіі і нашай краіны, адзначалася на семінары. І ў гэтым сэнсе важна трымаць марку. «У рабоце будаўнікоў для мяне на першым месцы стаіць якасць, — падкрэсліў старшыня аблвыканкама Юрый Шулейка. — Спажывец заплаціў грошы і мае права на дастойную якасць прадукту. Будаўнікам належыць заўсёды працаваць у гэтым кірунку. І здаваць гатовае жыллё трэба на тым узроўні якасці, з якім вы праводзіце адстройванне ўласных кватэр». А таксама паабяцаў: падчас работы ў Брэсце кожны жылы дом будзе прымаць сам, у тым ліку і ў рэгіёнах.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота Валерыя КАРАЛЯ.**

Жылая нерухомасць

# ПАНДЭМІЯ І ХОЛАД НЕ ДАЮЦЬ РЫНКУ «РАСКРЫЦЦА»

## У Мінску на продаж выстаўлена ўжо больш за 15 тысяч кватэр

**Рэальная актыўнасць любога рынку ацэньваецца яго канчатковымі вынікамі — здзелкамі.**
**Па колькасці здзелак гэты студзень мала чым адрозніваўся ад першых месяцаў папярэдніх дзесяці гадоў: за месяц купілі 807 кватэр, што з'яўляецца сярэднім значэннем для пачатку года.**
**У лютым спрацаваў механізм адкладзенага попыту за святочныя дні ў канцы і пачатку года — было зафіксавана 1030 здзелак.**

Па словах **дырэктара агенцтва нерухомасці «БелЦТН» і ганаровага старшыні ГА «Беларуская асацыяцыя «Нерухомасць» Мікалая ПРАСТАЛУПАВА,** актыўны сакавік мусіў быць працягам лютага, але ім не стаў. За тры тыдні месяца адзначана толькі 690 здзелак, што відавочна паказвае на малую актыўнасць пакупнікоў на рынку жыллёвай нерухомасці. Чаму і што адбылося?

### САКАВІЦКІ ХОЛАД І ЧАРГОВАЯ ХВАЛЯ КАРАНАВІРУСА

На думку нашага эксперта, вясной на актыўнасць кліентаў рынку ўздзейнічае эмацыянальна кліматычны парыў. Сонейка на вуліцы, выдатнае цёплае надвор'е «выганяюць» нас у горад на прагляды кватэр. Гэта калі надвор'е і сапраўды цудоўнае. Сёлета з прычыны халоднага сакавіцкага надвор'я (ці проста пахмурнага) былі адменены дзясяткі запланаваных сустрэч паміж патэнцыяльнымі пакупнікамі і прадаўцамі.

> **Наш эксперт лічыць, што рынак знаходзіцца ў стане спячкі, калі купляецца мінімум кватэр пры стабільна высокай прапанове. Так адбываецца з верасня мінулага года. Праходзяць самыя неабходныя здзелкі: людзі ўсё роўна разводзяцца, жэняцца, абзаводзяцца дзецьмі і востра маюць патрэбу ў асобнай кватэры менавіта тут і цяпер.**

Акрамя таго, пакінула дома людзей з грашыма навіна і наконт таго, што да нас прыйшла трэцяя хваля ўжо абрыдлай заразы. І таму кліенты адмаўляюцца ад кантактаў з абсалютна чужымі людзьмі. Масачнага рэжыму ў Мінску прытрымліваюцца практычна ўсе жыхары, але ўсё ж новых хворых яшчэ досыць вялікая колькасць. Людзі проста баяцца за сваё здароўе. Мабыць, маюць рацыю.

### ПАКУПНІКУ ЁСЦЬ ЧАС ПАЧАКАЦЬ

На думку экспертаў, самы моцны фактар, які ўздзейнічае на рынак нерухомасці, заключаецца ў тым, што пакуль невядома, калі скончыцца гэты крызіс — у нашай краіне, ды і наогул у Еўропе. Крызіс звязаны з аховай здароўя, палітыкай, эканомікай і фінансамі. Калі гаварыць выключна пра рынак нерухомасці, то таксама незразумела, калі завершыцца працэс патанення кватэр. Можа, варта яшчэ пачакаць, каб купіць яшчэ больш танна? Як намацаць тое самае дно мінімуму прапановы?



Пытанні пакуль застаюцца без адказаў. Апошнім часам на рынку адбылося залішняе назапашванне жыллёвых аб'ектаў, якія адначасова выстаўлены на продаж. Калі яшчэ ў студзені на рынак выстаўлялася больш за дзесяць тысяч кватэр і гэта лічылася максімумам за апошнія сем гадоў, то ў сакавіку назіраецца выбуховае павелічэнне колькасці такіх аб'ектаў нерухомасці (кватэр і іх доляў). Прапанова кватэр у Мінску працягвае расці: за апошнія сем дзён колькасць выстаўленых на продаж аб'ектаў павялічылася яшчэ на 6 %, перавысіўшы адзнаку ў 15 тысяч (15 398). У найбольшай ступені павялічылася колькасць аднапакаёвых і двухпакаёвых кватэр — на 9 % і 7 % адпаведна.

Такое рэзкае павелічэнне прапановы звязана з працяглым адставаннем рэалізацыі кватэр над іх вызваленнем. Акрамя таго, павольнае, але працяглае патанненне жылля змушае прадаваць свае кватэры нават тых людзей, хто аб продажы наогул не задумваўся. Маецца на ўвазе прынцып натоўпу.

### ДАРАГІЯ КРЭДЫТЫ І АДСУТНАСЦЬ УПЭЎНЕНАСЦІ Ў ЗАЎТРАШНІМ ДНІ

За апошні тыдзень трэнд на патанненне сталічнага жылля істотна павысіўся. Квадратны метр агульнай плошчы аднапакаёвых кватэр «асеў» адразу на 25 долараў (мінус 1,9 %), двухпакаёвых — на 15 долараў (мінус 1,2 %), трохпакаёвых — на 8 долараў (мінус 0,7 %), а чатырохпакаёвых кватэр — наогул на 40 долараў (мінус 3,4 %). Варта адзначыць той факт, што аднапакаёвае жыллё таннела ў мінулым месяцы з тэмпам 6,7 %, а за год яно страціла амаль 20 % ад вагі мінулага цэнніка. Двухпакаёвыя ж кватэры за месяц «скінулі» 4,9 %, а за год — амаль 15 % рыначнай вагі.

Што гэта? Намячаецца трэнд на сапраўды масавае патанненне гарадскога жылля, або мы назіраем кароткачасовую (значную) карэкціроўку цэн на розныя тыпы кватэр?

Сярэдняя цана прададзеных аднапакаёвых кватэр у Мінску склала 1278 долараў за квадратны метр. Двухпакаёвыя кватэры крыху таннейшыя — 1269 долараў, трохпакаёвыя — 1185 долараў.

Наш эксперт лічыць, што рынак знаходзіцца ў стане спячкі, калі купляецца мінімум кватэр пры стабільна высокай прапанове. Так адбываецца з верасня мінулага года. Праходзяць самыя неабходныя здзелкі: людзі ўсё роўна разводзяцца, жэняцца, абзаводзяцца дзецьмі і востра маюць патрэбу ў асобнай кватэры менавіта тут і цяпер. Такіх, як бачым, 600-700 здзелак у месяц.

Падзенне цікавасці да куплі жылля ў астатнім звязана з двума фактарамі: цэны прапановы ўсё яшчэ высокія, а наперадзе — няўпэўненасць у заўтрашнім дні. І нядаўняе вяртанне крэдытавання на другасны рынак на агульным настроі адбілася мала (усё ж такі крэдыт пад 21 % здаецца людзям дарагім).

### МОЦНАГА ПАДЗЕННЯ ЦЭН НЕ БУДЗЕ

Мікалай Прасталупаў лічыць, што ажно да ліпеня нейкага значнага патанення не адбудзецца. Будзе ісці павольная, часам хвалепадобная змена цэн у бок патанення. Каталізатарам рынку з'яўляецца новае жыллё. А такога жылля на рынку не хапае.

Так, другасны рынак заўсёды аглядаўся на цэны жылля ў новабудоўлях. Сёння ў галоўным мегаполісе краіны прапаноў па будаўніцтве катастрафічна не хапае. Будоўлю з нуля пачынаюць адна-дзве кампаніі. У мясцовых будаўнічых арганізацый не хапае сродкаў, каб без пазыковых грошай «пацягнуць» дадзенае мерапрыемства. Людзі ж таксама не спяшаюцца ўкладваць свае кроўныя ў доўгатэрміновыя праекты.

У гэтай сітуацыі наш суразмоўнік упэўнены, што «метры» будуць таннець, але значна меншымі тэмпамі, чым калі б будаўніцтва вялося ў актыўным рэжыме. Таму бліжэй да лета кватэры патаннеюць на 0,5—1 %, або на 1,5 % у месяц. Больш магутнаму патанненню будуць перашкаджаць адсутнасць канкурэнцыі на будаўнічым рынку і псіхалагічны «пункцік» нашых людзей «як бы не пераплаціць».

У свой час на рынку нерухомасці актыўна хадзілі чуткі, што падзеі ў краіне прывядуць да істотнага ад'езду за мяжу найбольш актыўнай часткі насельніцтва Мінска. У сувязі з гэтым на рынак будзе «выкінута» значная колькасць «чыстых» кватэр (тое жыллё, якое прадаецца без умовы куплі новага). І гэты факт прывядзе да яшчэ больш моцнага патанення кватэр.

Дык вось, гэтага не адбылося. Мікалай Прасталупаў запэўніў, што падобных з'яў на рынку не адзначалася. Можа, хто-небудзь і ад'язджаў з нашай краіны, але масавага продажу жылля ў сувязі з гэтым не было, заявіў наш эксперт. І хоць такія адзінкавыя аб'екты — і дамы, і кватэры — на рынку з'яўляюцца, «надвор'я» яны не робяць. Ды і не прадаюцца за бясцэнак.

### У РЭГІЁНАХ — КАЛІ І ПАДЗЕННЕ, ТО НЕВЯЛІКАЕ

За апошні тыдзень у абласных цэнтрах Беларусі назіралася як нязначнае зніжэнне цэннікаў, так і нязначнае падаражанне.

Напрыклад, у Брэсце квадратны метр нават трошкі падаражэў (+0,2 %) і прадаецца сёння за 802 долары, у Віцебску метр таксама нязначна, але патаннеў — 603 долары (-0,2 %), Гомель — 621 долар (-0,2 %), Гродна — 709 долараў (+0,4 %), Магілёў — 647 долараў (+0,3 %). У буйных гарадах Мінскай вобласці сярэдні ўзровень цэн на кватэры апынуўся на такіх адзнаках: Барысаў — 613 долараў за «квадрат» (без змен), Салігорск — 791 долар (-0,9 %), Маладзечна — 748 долараў (+0,9 %), Жодзіна — 718 долараў (+0,5 %), Слуцк — 606 долараў (+0,4 %).

**Сяргей КУРКАЧ.**


СВЕДЕНИЯ О РЕЗУЛЬТАТАХ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

**«Счастливая пара»**

Сведения об организаторе – Общество с ограниченной ответственностью «ЭфСиБи Бел», УНП 193185741.

Юридический адрес: Республика Беларусь, г. Минск, пер. Козлова, д. 25, пом. 22.

Территория проведения рекламной игры: магазины «Соседи» и «Соседи экспресс», находящиеся на территории Республики Беларусь.

Срок начала Рекламной игры: 1 февраля 2021 г.

Срок окончания Рекламной игры: 31 марта 2021 г.

Сведения о государственной регистрации рекламной игры: свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 3922 от 29 декабря 2020 г., выданное Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

Сведения о количестве участников рекламной игры: 216 903 уникальных участника.

Призовой фонд разыгран полностью.

**Победители: Полная информация о победителях Рекламной игры опубликована по ссылке www.sosedi.by**

Телефоны для справок по вопросам проведения рекламной игры: +375 33 382 66 00, +375 29 382 66 00

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/оператор** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б, www.ipmtorgi.by** |
| **Продавец** | **ООО «БелВЭБ Капитал», г. Минск, ул. Карла Либкнехта, д. 66, пом. 21а, ком. 1** |
| **Предмет электронных торгов** | |
| **1/10 доли в праве собственности на капитальное строение** с общ. пл. капитального строения 2486,7 кв. м, инв. номер 422/С-3271 по адресу: г. Щучин, ул. Пушкина, 26. **Сведения о земельном участке:** пл. 0,5681 га предоставлен продавцу для содержания и обслуживания административного здания на праве постоянного пользования (доля 1/10). Обременение: **находится в залоге у ОАО «Банк БелВЭБ»** | |
| **Начальная цена с НДС 20 % – 41 344,03 бел. руб.** | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях (BYN) перечисляется на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638. | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10 (десять)** рабочих дней после электронных торгов |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов** | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи | |
| **Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by** | |
| Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение от 1 до 5 % от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов | |
| Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия | |
| Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 04.12.2021 г. | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов**. Начало торгов – **10.00 07.04.2021 г.** Окончание торгов – **12.00 07.04.2021 г.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов | |
| **Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **05.04.2021 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by | |
| **Контактные телефоны** | **+375 17-280-36-37; +375 (29)-317-95-42; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by; info@ipmtorgi.by** |

ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: 8 (017) 298-53-53; 8 (029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**

Продавец: **ООО «Фильм Ваген»** (УНП 691595834) в лице ликвидатора ИП Кобашовой Марии Владимировны, тел. +37529 684-83-15.

Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены: **09 апреля 2021 г. 09.00–17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY**.

Предмет торгов – ***Фургон (прицеп специальный) KUPAVA 822000, 2015 г. в., белый***.

Начальная цена предмета торгов – 7586,25 бел. руб. без НДС. Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Местонахождение: Минская обл., Минский р-н, д. Василевщина, д. 63, тел. для ознакомления и осмотра +37544 700-50-05.

**Для участия в торгах необходимо в срок** с 27.03.2021 г. 09.00 по 08.04.2021 г. 16.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов: не позднее 20 календарных дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 05.03.2021 г.

УНП 191514793

ООО «Расантехторг»

**объявляет о проведении электронных торгов 21.04.2021 г. по продаже имущества ООО «Антерго»**

**Модуль № 1, 2**

начальной стоимостью 15 000,00 рублей.

На сайте **www.torgi24.by** размещена вся информация о торгах.

Справки по телефону +375 29 6970181, Тимофей (9.00 – 18.00).

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

26 сакавіка 2021 г. № 11 (596)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


# «ШТО Я ЗРАБІЎ БЫ, КАЛІ Б БЫЎ СЕНАТАРАМ?»



## Фіналісты і пераможцы тэматычнага конкурсу сустрэліся са старшынёй Савета Рэспублікі Наталляй КАЧАНАВАЙ

**У сераду, 24 сакавіка, у верхняй палаце парламента адбылося ўзнагароджанне фіналістаў і пераможцаў рэгіянальнага конкурсу сачыненняў «Калі б я быў сенатарам...», удзел у якім прынялі школьнікі і навучэнцы каледжаў Камянецкага і Маларыцкага раёнаў Брэстчыны.**

Ініцыявалі конкурс сачыненняў сярод моладзі сенатары ад Брэсцкага рэгіёна — Аляксандр Карпіцкі і Тамара Шатлікава. І гэтая ідэя знайшла падтрымку ў дзяцей, якія выказалі сваё погляды на заканатворчую дзейнасць: што іх хвалюе і што б яны хацелі змяніць. І самае галоўнае — маладыя людзі змаглі трапіць у верхнюю палату парламента і сустрэцца з яе старшынёй.

— Я шчыра рада, што вы сёння тут. Гэта дазваляе вам бліжэй пазнаёміцца з работай Савета Рэспублікі і тым, чым займаюцца сенатары, якія працуюць у складзе Нацыянальнага сходу, — падкрэсліла Наталля Качанава. Яна звярнула ўвагу, што Савет Рэспублікі адкрыты для ўсіх, асабліва для моладзі.

— Мы ўзялі за практыку не толькі выязджаць у школы і сустракацца са школьнікамі, але і праводзіць мерапрыемствы тут, — адзначыла яна.

Спікер верхняй палаты парламента пераканана, што гэта вельмі карысна. Таму што, згодна з яе ўласным меркаваннем, калі б у сваім юным узросце пабывала ў такім месцы, напэўна, памяць засталася б на ўсё жыццё.

— Думаю, што гэтае першае ваша знаёмства з дзейнасцю такога сур'ёзнага дзяржаўнага органа дазволіць калісьці ў далейшым увасобіць вашу мару, — падкрэсліла яна. — Магчыма, вы будзеце працаваць у гэтай самай зале і згадваць гэты час.

А ідэі маладых людзей, і праўда, заслугоўваюць увагі сенатараў і, магчыма, у будучыні дазволяць ім сфарміравацца як грамадскім дзеячам і актывістам.

— У сваім творы я напісаў пра тое, што хацеў бы заахвоціць моладзь заставацца ў родным краі. Але для гэтага трэба ствараць умовы, развіваць інфраструктуру, будаваць жыллё для маладых сем'яў, ствараць працоўныя месцы, — кажа першакурснік Высокаўскага дзяржаўнага сельскагаспадарчага прафесійна-тэхнічнага каледжа Антон Тарасюк. — Напрыклад, на маёй малой радзіме я стварыў бы прадпрыемства па апрацоўцы керамікі альбо гліны. Дарэчы, асабіста я з'язджаць са свайго раёна нікуды не збіраюся і планую застацца.

Адзінаццацікласніца Олтушскай сярэдняй школы Маларыцкага раёна Надзея Дземядзюк расказала, што на прапанову настаўніка гісторыі паўдзельнічаць у творчым конкурсе пагадзілася адразу:

— Хацелася не толькі ўявіць сябе на такой пасадзе, але і даведацца нешта новае. У сваёй рабоце я ўзняла некалькі пытанняў. На першым месцы для мяне — экалогія. Пісала таксама аб культурным і творчым развіцці моладзі, антыкарупцыйнай дзейнасці. Дапамагалі мне ў гэтым мама і мая настаўніца. Гэта наша калектыўная перамога.

Пасля ўзнагароджання маладыя людзі мелі магчымасць задаць пытанні спікеру верхняй палаты парламента. А цікавіла іх тое, як можна трапіць у склад маладзёжнага парламента, які функцыянуе пры Савеце Рэспублікі, чым займаюцца сенатары ў міжсесійны перыяд і калі ў Беларусі створаць уласную вакцыну ад COVID-19. На гэтыя і іншыя пытанні ўдзельнікі атрымалі шчырыя і разгорнутыя адказы не толькі ад Наталлі Качанавай, але і ад членаў таго ж маладзёжнага парламента пры Савеце Рэспублікі. У выніку атрымалася грунтоўная і зацікаўленая размова.

— Мы пачулі, як маладыя людзі ўспрымаюць дзейнасць членаў Савета Рэспублікі, як яны яе ацэньваюць, што яны зрабілі б. І для нас гэта вельмі важна, — адзначыла напрыканцы ў гутарцы з журналістамі Наталля Качанава. — Я ўдзячная, што маладыя людзі прывезлі свае сачыненні сюды. Мы іх уважліва прачытаем і абавязкова знойдзем ім месца ў нашым музеі. Гэта добрая ініцыятыва, якая будзе падтрымана не толькі ў Брэсцкай вобласці.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

## Зялёнае святло закону «Аб дарожным руху»

### Выдача міжнародных вадзіцельскіх правоў, прызнанне расійскіх і экзамен на «аўтамаце»

**ЗМЯНЕННІ ў Закон «Аб дарожным руху» разглядалі на пашыраным пасяджэнні Пастаяннай камісіі па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі Палаты прадстаўнікоў. У абмеркаванні ўзялі ўдзел прадстаўнікі Міністэрства ўнутраных спраў.**

**Старшыня Пастаяннай камісіі па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі Палаты прадстаўнікоў Ігар КАМАРОЎСКІ** адзначыў, што асноўная мэта ўдасканалення законапраекта — павышэнне бяспечнасці дарожнага руху, выкараненне праўвых прабелаў.

«Хачу адзначыць, што ўводзіцца норма, якая захоўвае права грамадзян Расійскай Федэрацыі ў рамках Саюзнай дзяржавы выкарыстоўваць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь вадзіцельскае пасведчанне нацыянальнага ўзору Расійскай Федэрацыі. Гэта вельмі чаканы момант для многіх грамадзян. Уводзяцца пэўныя паслабленні для аўташкол у частцы спрашчэння парадку выкарыстання маршрутаў, на якіх навучаюцца кіраванню курсанты (раней іх неабходна было ўзгадняць з ДАІ. — **«Зв.»**)», — адзначыў Ігар Камароўскі.

Для гісторыі дадзенага законапраекта знакавы 2018 год, калі прапанавалі ўвесці бальную сістэму ацэнкі правапарушэнняў кіроўцамі, нагадаў парламентарый. Але такую сістэму ні грамадскасць, ні кіраўніцтва краіны не падтрымалі.

**Намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення ДАІ МУС Аляксандр ЗАНІМОН** паведаміў, што асноўныя змяненні ў заканадаўстве звязаныя з пашырэннем магчымасці рэалізацыі палажэнняў Канвенцыі аб дарожным руху 1968 года. «Адно з такіх палажэнняў прадугледжвае магчымасць выдачы міжнароднага вадзіцельскага пасведчання. Хоць наша нацыянальнае вадзіцельскае пасведчанне адпавядае ўсім патрабаванням гэтай Канвенцыі. Але некаторыя краіны, што не далучыліся да гэтай Канвенцыі і не маюць магчымасці пераняць яе палажэнні для сябе, патрабуюць міжнароднага вадзіцельскага пасведчання», — дадаў Аляксандр Занімон.

Па яго словах, міжнародныя вадзіцельскія правы новага ўзору ўжо выдаюцца ў нашай краіне год пасля ўнясення адпаведных змяненняў ва Указ Прэзідэнта № 200. То-бок навацыі ў законапраект маюць тэхнічнае значэнне.

Наконт агульных вадзіцельскіх пасведчанняў Саюзнай дзяржавы Аляксандр Занімон адзначыў, што яны будуць прызнавацца нашымі краінамі ўзаемна. «Не будзем патрабаваць пры атрыманні грамадзянства і віду на жыхарства расіянамі замены іх вадзіцельскага пасведчання на наша нацыянальнае. Тыя ж самыя крокі прымае расійскі бок», — падкрэсліў прадстаўнік МУС.

Ён таксама звярнуў увагу, што пры падрыхтоўцы законапраекта разглядалася магчымасць атрымання права на кіраванне транспартным сродкам на аўтаматычнай каробцы перадач.

«Вывучыўшы вопыт шэрагу краін, дзе такая магчымасць прадугледжана, таксама вырашылі ўнесці для зручнасці нашых грамадзян магчымасць навучання і здачы экзаменаў на аўтаматычнай каробцы перадач. Адпаведна, права на кіраванне будзе перадавацца выключна на транспартны сродак з аўтаматычнай каробкай перадач», — паведаміў Аляксандр Занімон.

Законапраектам мяркуецца функцыі па маніторынгу эфектыўнасці арганізацыі дарожнага руху ўскладаць на Мінтранспарту і мясцовыя органы ўлады — уладальнікаў дарог.

«Размова ідзе аб паляпшэнні арганізацыі дарожнага руху, каб пазбегнуць заторных сітуацый у буйных населеных пунктах», — растлумачыў намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення ДАІ МУС.

На пасяджэнні прадстаўнік ДАІ прывёў статыстыку па дарожна-транспартных здарэннях за мінулы год. Так, летась упершыню больш чым за дзесяць гадоў колькасць загінулых у ДТЗ павялічылася да 573 чалавек. Большасць смерцяў звязана з наездам на пешаходаў.

**Марыя ДАДАЛКА.**

## «Гарачы» тэлефон

НА СУВЯЗІ!



27 сакавіка з 10.00 да 12.00 **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ** правядзе ў Савеце Рэспублікі прамую лінію. Задаць сваё пытанне Таццяне Аркадзеўне можна па тэлефоне (8-017) 328-53-24.

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

# «ЛЮДЗЕЙ ЦІКАВІЦЬ НЕ ТОЛЬКІ БЫТ, АЛЕ І ЗАХАВАННЕ ДЗЯРЖАВЫ»

## Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАЧКОЎ правёў прыём грамадзян



**СПЕКТР узнятых праблем быў самы разнастайны: ад непаразуменняў з былым працадаўцам да нармалізацыі адносін нашай краіны са знешнім светам.**

У прыватнасці, жыхарка Лепеля Іна Аляксандраўна скардзілася Сяргею Рачкову на неадэкватныя, з яе пункту гледжання, адносіны да яе былой працадаўцы, якая працуе ў сферы турызму. Жанчыну не звязваюць працоўныя адносіны з турыстычнай арганізацыяй ужо сем гадоў, але да гэтага часу ўзаемапаразуменне па некаторых пытаннях бакі так і не змаглі знайсці. Нават у судовым парадку.

Сяргей Рачкоў параіў заяўніцы акрэсліць спіс пытанняў больш канкрэтна, а не агулам, як агучыла жанчына:

— Чаго вы дамагаецеся? Канчатковага разліку, выдачы працоўнай кніжкі ці пералічэння ўзносаў у фонд сацыяльнай занятасці насельніцтва? — спытаў ён і паабяцаў заяўніцы ўважліва разабрацца па кожным з пастаўленых пытанняў. Дарэчы, да вывучэння яе сітуацыі даручана далучыцца і праваахоўным органам.

Мінчанін Вадзім Уладзіміравіч таксама прыйшоў са сваёй працоўнай праблемай — ён прасіў сенатара пасадзейнічаць у аднаўленні на службе ў органах унутраных спраў. Жыхарку з Жодзіна Галіну Іванаўну цікавіла пытанне афармлення спадчыны. А вось жыхар Баранавіч Сяргей Сяргеевіч і мінчанін Сяргей Мікалаевіч прыйшлі да сенатара з пытаннем, звязаным з нармалізацыяй адносінаў Рэспублікі Беларусь са знешнім светам і вывадам краіны з крызісу.

— Звычайна людзі прыходзяць са скаргамі, але зараз больш актыўна звяртаюцца грамадзяне з выказваннем сваёй грамадскай, палітычнай пазіцыі, — адзначыў у гутарцы з журналістамі Сяргей Рачкоў. — І тэлефонныя званкі, і асабістыя прыёмы атрымалі распаўсюджанне і большую практыку, што сведчыць: сёння людзей хвалюе не толькі быт, але і захаванне нашай беларускай дзяржавы.

Ён падкрэсліў, што большасць заяўнікаў, якія тэлефануюць у Савет Рэспублікі і выказваюць свае меркаванні (гэта датычыцца і пісьмовых зваротаў), выступаюць за падтрымку дзяржаўнага курса, развіццё нашай дзяржавы і стабільнасць:

— Тое, што забяспечыць устойлівае, мірнае, спакойнае жыццё, — акцэнтаваў увагу старшыня профільнай камісіі.

Акрамя таго, ён адзначае рост даверу насельніцтва да Савета Рэспублікі ў цэлым. Паводле слоў сенатара, за два з паловай месяца да членаў Прэзідыума Савета Рэспублікі паступіла амаль 650 толькі пісьмовых зваротаў.

— Мы робім акцэнт на дбайнасці і дакладнасці разгляду кожнага звароту, — падкрэсліў ён. — Для гэтага па асобных сітуацыях запрашаем людзей сюды, у Савет Рэспублікі, гутарым, удакладняем. Калі паступаюць звароты з рэгіёнаў, даручаем сенатарам, якія працуюць там, сустрэцца з заяўнікамі і высветліць дадатковыя дэталі.

Акрамя таго, пры разглядзе зваротаў стала больш актыўна выкарыстоўвацца практыка выездаў на месцы. Не так даўно ў профільную камісію паступіў сігнал аб тым, што ў адным з дамоў у Мінску быццам бы вырабляюцца наркатычныя сродкі. Разам з супрацоўнікамі МУС прадстаўнікі Савета Рэспублікі выехалі па ўказаным адрасе і ўважліва разабраліся ў сітуацыі, якая апісвалася ў звароце.

Трэба сказаць, што ў перыяд эпідэміі каранавіруса асаблівую ўвагу сенатары ўдзяляюць зваротам сталых людзей, паколькі гэтая катэгорыя людзей адносіцца да групы павышанай рызыкі і менавіта ёй імкнуцца дапамагчы перш за ўсё.

Як патлумачыў Сяргей Рачкоў, у прыватнасці, у Салігорску дапамаглі Ірыне Уладзіміраўне з атрыманнем матэрыяльнай дапамогі на аздараўленне, а Анатолю Іванавічу — з пуцёўкай у санаторый «Бярозка».

— Ведаеце, ёсць і нечаканыя звароты. У нашу камісію, напрыклад, паступіў зварот аднаго замежнага інвестара, якому быў абмежаваны ўезд у Рэспубліку Беларусь. Па нашым прадстаўленні кампетэнтныя органы разгледзелі гэтую сітуацыю і прыйшлі да высновы, што абмежаванне можа быць знятае, — расказаў сенатар. — Мы рады бачыць у нашай краіне замежных інвестараў, турыстаў, вядома, тых, хто выконвае беларускія законы і, безумоўна, зацікаўлены ў тым, каб развіваць інвестыцыйнае і турыстычнае супрацоўніцтва.

Падсумоўваючы праблематыку зваротаў, старшыня профільнай камісіі адзначыў, што яна вельмі шырокая і разнастайная: гэта і жыллёва-камунальныя пытанні, і добраўпарадкаванне, і іншыя — усё, што хвалюе людзей.

Паразважаў сенатар і на тэму заканадаўчых змен.

— Зараз пачала работу Канстытуцыйная камісія. Канешне, неабходна карэктаваць Асноўны Закон краіны, але само жыццё стварае гэты закон, і людзей больш за ўсё хвалюе не палітыка, а канкрэтныя пытанні, звязаныя з іх якасцю жыцця, выразшэннем злабадзённых, штодзённых праблем, — падкрэсліў Сяргей Рачкоў. — Таму, калі мы праводзім прыёмы грамадзян, звяртаем увагу на тое, каб зрабіць зрэз, які дазваляе нам трымаць руку на пульсе і выкарыстоўваць атрыманую інфармацыю ў заканатворчай дзейнасці.

**Вольга АНУФРЫЕВА, фота аўтара.**

ПРАВЫ ДЗІЦЯЦІ

### НІ АДНО ПЫТАННЕ НЕ ЗАСТАНЕЦЦА ПА-ЗА ЎВАГАЙ

**У адміністрацыі Маскоўскага раёна сталіцы старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, намеснік старшыні Нацыянальнай камісіі па правах дзіцяці Віктар ЛІСКОВІЧ правёў прыём непаўналетніх і іх законных прадстаўнікоў у рамках работы Нацыянальнай камісіі па правах дзіцяці.**

Парламентарый адказаў на пытанні, якія датычацца падтрымкі шматдзетных сем'яў, парадку выкарыстання мацярынскага капіталу, а таксама льгот выпускнікам профільных класаў пры паступленні ва ўстановы вышэйшай адукацыі, паведаміла ў профільнай камісіі. Былі закрануты праблемы, звязаныя з паляпшэннем жыллёвых умоў шматдзетных сем'яў, аплатай працы выхавальнікаў і іншыя.

— Члены Нацыянальнай камісіі па правах дзіцяці па графіку праводзяць асабістыя прыёмы ва ўсіх рэгіёнах краіны, — адзначыў сенатар. — Ні адно пытанне не застанецца па-за ўвагай. Дзеці павінны адчуваць сябе абароненымі.

Правядзенне наступнага прыёму Віктар Лісковіч анансаваў у Брэсце на 6 красавіка.

НАД ЧЫМ ПРАЦУЕМ?

### АДНА ІНФАРМАЦЫЙНАЯ ПРАСТОРА І АДМЕНА РОЎМІНГУ

**ДНЯМІ член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Андрэй ШЫШКІН прыняў удзел у пасяджэнні Камісіі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі па інфармацыйнай палітыцы, якое адбылося ў сталіцы Расіі.**

— Парадак дня быў насычаны, — расказаў сенатар. — Беларускія і расійскія парламентарыі абмеркавалі некаторыя аспекты фарміравання агульнай інфармацыйнай прасторы Саюзнай дзяржавы, адзіную палітыку супрацьстаяння інфармацыйным пагрозам, эфектыўнасць дзейнасці саюзных СМІ і планы па іх далейшым развіцці, адмену роўмінгу на тэрыторыі Саюзнай дзяржавы.

Дарэчы, па апошняй тэме ёсць сур'ёзныя зрухі, паведаміў суразмоўнік: усе мерапрыемствы па адмене роўмінгу паміж дзвюма краінамі могуць быць завершаны да 2 красавіка — Дня яднання народаў Беларусі і Расіі.

— Калі ўсё складзецца ўдала, то гэта, без сумневу, будзе самы добры падарунак да свята і для беларусаў, і для расіян! — адзначыў ён.

З ВЫЕЗДАМ НА МЕСЦА

# МАРКЕРЫ ЯКАСЦІ ЖЫЦЦЯ НА ВЁСЦЫ

**ЯКАСЦЬ жыцця ў сельскіх населеных пунктах і пытанні мясцовага значэння разгледзелі дэпутаты Ельскага раённага Савета дэпутатаў падчас выязнога пасяджэння. Члены пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце, фінансах і камунальнай уласнасці, кіраўнікі дзяржаўных устаноў і арганізацый, а таксама прадстаўнікі сельвыканкамаў наведалі Старавысокаўскі сельскі Савет. Удзельнікі прааналізавалі ўзровень і якасць забеспячэння дзяржаўных сацыяльных стандартаў па абслугоўванні насельніцтва.**



Вывучэнне асартыменту прадукцыі ў краме індывідуальнага прадпрымальніка ў аг. Зашыр'е.

Старавысокаўскі сельсавет — адзін з самых буйных на тэрыторыі Ельскага раёна, у яго дзесяці населеных пунктах пражывае 1637 чалавек. Ад Ельска да цэнтра сельсавета — аграгарадка Старае Высокае — 27 кіламетраў. Тут ёсць фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне паштовай сувязі, комплексна-прыёмны пункт Ельскага камбіната бытавога абслугоўвання, крама, цэнтр культуры і адпачынку, яслі-сад — пачатковая школа. Падчас наведвання кожнага з гэтых сацыяльна значных аб'ектаў дэпутаты цікавіліся, як аказваюцца паслугі з улікам сучасных патрабаванняў людзей.

Па словах **старшыні пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце, фінансах і камунальнай маёмасці Ельскага раённага Савета дэпутатаў Яўгена МАТУЗКІ**, сёлета ў раёне працягваюць праводзіць мэтанакіраваную работу па выкананні сацыяльных стандартаў. Таму на асаблівым кантролі дэпутатаў — камфортнасць, даступнасць і своечасовасць паслуг, якія аказваюць жыхарам сельскіх населеных пунктаў. Увага ўдзяляецца і пастаяннай рабоце па ўмацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы вясковых сацыяльных устаноў.

На тэрыторыі Старавысокаўскага сельсавета ўдзельнікі выязнога пасяджэння сустрэкалі кіраўнікі службаў, якія адказваюць за ахову здароўя, адукацыю, культуру, ЖКГ, гандаль, сувязь, бытавое абслугоўванне. Выкананне нарматываў па сацыяльных стандартах прааналізавалі па зацверджаных пашпартах, якія з пачатку года рыхтаваў кожны сельвыканкам. Паказчыкі па вадзе, святле, газазабеспячэнні, дарожнай гаспадарцы выкананы для ўсіх населеных пунктаў сельсавета, — адзначаюць дэпутаты.

Удзельнікі выязнога пасяджэння райсавета наведалі таксама аграгарадок Зашыр'е, дзе пражывае значная частка ўсіх жыхароў Старавысокаўскага сельсавета. Населены пункт — візітка Ельшчыны. На слыху культурнае жыццё ў Зашыр'і: тут развіваюць турыстычны кірунак, фальклорную дзейнасць, этнаграфію, краязнаўства... Мясцовыя самадзейныя калектывы часта выступалі не толькі ў гарадах Беларусі, але і за яе межамі.

Дэпутаты пацікавіліся, як у аграгарадку развіваецца гандаль, як працуе бальніца сястрынскага догляду. У Зашыр'і дзейнічае адзіны на сельскай тэрыторыі раёна філіял «Беларусбанка», паслугі аказвае фірмовая крама і сталовая мясцовай гаспадаркі КСУП «Саўгас «Камуніст», ёсць культурна-спартыўны цэнтр, рамесны гарадок. Не так даўно аднаўлены будынак Ельскага лягаса, з'явіліся новыя дзіцячыя пляцоўкі.

— Важныя складнікі жыцця на вёсцы — школа, дзіцячы садок, установа аховы здароўя, культуры. Гэта не толькі аб'екты, дзе аказваюцца сацыяльна значныя паслугі для вяскоўцаў, але і падмурак для замацавання маладых спецыялістаў, месца, куда могуць вяртацца нашы выпускнікі пасля заканчэння вышэйшых навучальных устаноў, калледжаў, — звяртае ўвагу **старшыня Ельскага раённага Савета дэпутатаў Аксана ЗАХАРЧАНКА.**

Аксана Аляксееўна адзначае, што выкананне сацыяльных стандартаў — сёння найважнейшая задача дзяржаўнай падтрымкі людзей на вёсцы. Дзеліца старшыня Ельскага райсавета і канкрэтнымі крокамі, якія сёлета атрымалася зрабіць па забеспячэнні сацыяльных нарматываў. Так, у Зашырскай сярэдняй школе адкрыта пасля рэканструкцыі спартыўная зала, якая па аснашчанасці і функцыянальнасці не саступае гарадскім аб'ектам. У раёне паказчык забеспячэння дзяцей месцамі ва ўстановах дашкольнай адукацыі на пачатак года склаў 99,5 % пры нарматыве 85 %.

Між тым на кантролі дэпутацкага корпуса раёна застаюцца пытанні працаўладкавання людзей, папулярызацыі прадпрымальніцкай актыўнасці сярод жыхароў сельскай мясцовасці, забеспячэння якаснай пітной вадой. На тэрыторыі Старавысокаўскага сельсавета сёлета ўпершыню плануюць укараніць практыку вывазу смецця з агульнай кантэйнернай пляцоўкі.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

Фінальны старт

# Хто трапіць у каманду праекта «ПІН_КОД»?

**Кастынг, мэтай якога было адабраць прэтэндэнтаў на ролю вядучых інтэрактыўнага маладзёжнага праекта «ПІН_КОД» на «Беларусь 2», выйшаў на фінішную прамую. Цяпер на працягу двух месяцаў 12 таленавітых школьнікаў і студэнтаў будуць праходзіць прафесійнае навучанне ў камандзе «пінкодаўцаў».**

— Да фіналу ў выніку дойдуць не ўсе, таму што кожны тыдзень прэтэндэнты павінны будуць выконваць творчыя заданні, якія маюць дачыненне да тэлевізійнай вытворчасці, а вынікі іх намаганняў ацэніць прадзюсарская група тэлеканала «Беларусь 2». Тыя, хто набярэ найменшую колькасць балаў, будуць пакідаць спаборніцтва. Але ўратаваць ад «вылету» зможа «імунітэт» ад гледачоў, якія змогуць аддаваць свае галасы за «любімчыкаў», — расказвае кіраўнік праекта «ПІН_КОД» Ягор Шолькін.

Варта адзначыць, што кастынг па адборы прэтэндэнтаў на ролю вядучага маладзёжнага праекта быў распачаты ў лютым у рамках праекта «Хачу ў тэлевізар», і на яго падало свае заяўкі больш за паўсотню чалавек з розных рэгіёнаў Беларусі. Аднак у лік шчасліўчыкаў трапілі толькі самыя крэатыўныя і вясёлыя. І цяпер будучых тэлевядучых чакаюць 12 майстар-класаў, дзе яны змогуць зазнаць усе тонкасці работы ў прамым эфіры, навучацца самастойна ствараць сюжэты і ўдасканаляць тэхніку валодання мовай. Імя пераможцы, які пройдзе ўсе выпрабаванні і трапіць на запаветную вакансію, гледачы даведаюцца летам. З 26 сакавіка па пятніцах гледачоў пачалі знаёміць з усімі прэтэндэнтамі, а сачыць за перыпетыямі спаборніцтва аўдыторыя можа з аўторка да пятніцы ў 15.45 на «Беларусь 2».

**Алена ДРАПКО.**

## ШАШКІ («Звязда»)

Выпуск № 136

З 6 да 13 сакавіка 2021 года ў Мінску, у Рэспубліканскім цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі па шахматах і шашках, праходзілі чэмпіянаты Беларусі па шашках-64 сярод мужчын і жанчын. У мужчынскім чэмпіянаце гулялі чатыры міжнародныя гросмайстры, у жаночым — тры. Турніры гуляліся па швейцарскай сістэме ў дзевяць тураў па сістэме мікраматчаў з двух партый (белымі і чорнымі) з жараб'ёўкай хадоў і пазіцый.

У мужчын чэмпіёнам Беларусі другі год запар стаў дзеючы чэмпіён свету па шашках-64, міжнародны гросмайстар з Ваўкавыска Ігар Міхальчанка. Ён набраў 14 ачкоў з 18 магчымых. Сярэбраны медаль у сталічнага шашыста, міжнароднага майстра Аляксея Куніцы — 14 ачкоў, але горшы каэфіцыент. Бронзавы медаль заваяваў міжнародны гросмайстар з Мінска Уладзіслаў Валюк — 13 ачкоў.

У жанчын перамагла дзеючая чэмпіёнка Еўропы Вера Хвашчынская (Бабруйск) з вынікам 13 ачкоў з 18 магчымых. Міжнародны майстар з Мінска Паліна Пятрусёва паказала такі самы вынік, але трохі горшы каэфіцыент адвёў ёй другое месца. Бронзавы медаль у сталічнай спартсменкі, міжнароднага гросмайстра Дар'і Федаровіч — 12 ачкоў. Толькі пятае месца ў дзеючай чэмпіёнкі свету Яны Якубовіч.

Паглядзіце некалькі прыкладаў гульні з чэмпіянату.

**№ 37**



**№ 37** Я. Жукоўскі — М. Семянюк

**Белыя простыя шашкі:** a3, a5, d2, g3, g5 (5)

**Чорныя простыя шашкі:** c5, d4, e5, e7, f8 (5)

Становішча белых цяжкае і яны трапляюць на камбінацыю 1.d2-c3? d4:b2 2.a3:c1 пакажыце ўдар.

**№ 38** Шпак Д. — Невар Н.

**Белыя простыя шашкі:** a3, b2, c1, e1, g3, h6 (6)

**Чорныя простыя шашкі:** a5, d6, d8, e5, e7, f8 (6)

Чорныя з дапамогай пагрозы пранікаюць у дамкі, адшукайце гэтую магчымасць самастойна.

Шашачны кампазітар з Літвы, міжнародны гросмайстар па шашачнай кампазіцыі Валдас Беляўскас у сваім лісце піша: «Шашачны раздзел газеты «Звязда» — прывабны, інфарматыўны. Не пабаюся сказаць, што публікавацца ў вашых шашачных раздзелах — прэстыжна!» І прапануе свае новыя кампазіцыі ў шашках-100.

**№ 39**

**Белыя простыя шашкі:** 43, 33, 27, 22, 11, 13, 9 (7)

**Чорныя простыя шашкі:** 41, 34, 35, 29, 24, 18, 2 (7)

**№ 40**

**Белыя простыя шашкі:** 47, 43, 39, 33, 24, 9 (6)

**Чорныя простыя шашкі:** 31, 32, 29, 16, 15, 10 (6)

Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

З лістоў чытачоў: «Дзякуем аўтарам і вядучаму! Усё было цікава: такія пазіцыі рашаць — радасць і задавальненне!» — пішуць Фёдар Карпей і Леанід Жыхар з Мядзела.

**Анонс:** 5 красавіка ў Оршы адбудзецца адкрыты раённы турнір па шашках-64. Даведкі па тэлефоне +375292980034, Невар Мікалай.

Пайшоў з жыцця шматгадовы адказны сакратар Беларускай федэрацыі шашак, майстар спорту Павел Шацоў (30.11.1962 — 18.03.2021). Светлая памяць.

Праверце свае рашэнні:

**Выпуск № 135** ад 12.03.21.

№ 31 1.c3-d4 3.00/23 — 7.35 b8-a7 2.h2-g3 a7-b6 3.g3-f4 d6-c5 4.d4-e5 c7-d6 5.a5:c7 d6:b8 6.e5-d6 c5:e7 7.c1-b2 a3:g5 8.h4:d8+

№ 32 1.07-02 21:12 2.46-41 37:46 3.11-06 46:30 4.06-01 26:37 5.01:40 35:44 6.02:47 +

№ 33 1.12-8 26:46 2.47-41 2:13 3.29-24 30:10 4.15:4 46:37 [ 4...46:32 5.4:35 28-32 ( 5...28-33 6.35-30 33-38 7.30-48 ) 6.35-24 32-37 7.24-47 ] 5.4:45 28-32 [ 5...28-33 6.45-34 33-38 7.34-48 ] 6.45-29 32-37 7.29-47+

№ 34 1.d2-e3 x7/51 — 0.03 e5:a5 2.e3:e7 f8:b4 3.h6:f8 won b4-c3 4.f8-g7 c3-d2 5.g7-c3 d2:b4 6.a3:c5

№ 35 1.f2-g3 xN(3)/51 — 0.04 e5:e1 2.g3:g7 e1:a5 3.h4:d8 f8:h6 4.c5-b6+

№ 36 1.e1-d2 x4/51 — 0.01 c3:g3 2.a1:c3 f4:b4 3.h2:f8 h6:f4 4.f8:a5+

Першыя дакладныя адказы даслалі С. Рашэцін ( Ашмяны), В. Таўкачоў (в. Уздзевічы, Клімавіцкі р-н, Магілёўская вобл.), В. Дударэвіч (Брэсцкая вобл., Баранавіцкі р-н, в. Новая Мыш), Э. Дамброўскі, П. і В. Шульгі, (усе — Мінск), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва — Мядзел), У. Панько (Каменец), І. Ананіч (Гродна), В. Ваўчкоў (Маладзечна), С. Лойка (Украіна).

*Пішыце на адрас: газета «Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, г. Мінск,*

*e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru*

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Сядзі і глядзі

## Дзень тэатра ў эфіры «Беларусь 3»!

**Да Сусветнага дня тэатра сацыякультурны канал медыяхолдынга падрыхтаваў падборку тэлеверсій актуальных беларускіх спектакляў, сярод якіх ёсць і нядаўнія прэм'еры. Тэлеканал «Беларусь 3» традыцыйна далучаецца да віншавання ўсіх прадстаўнікоў тэатральнага мастацтва, прапануючы гледачам напярэдадні і ў сам святочны дзень толькі найлепшыя пастаноўкі беларускіх тэатраў і пазнавальныя аповеды пра тэатральнае асяроддзе.**

Так, 26 сакавіка на «Беларусь 3» можна будзе ўбачыць спектакль Тэатра-студыі кінаакцёра «Хто смяецца апошнім» па п'есе Кандрата Крапівы (125-годдзе з дня нараджэння пісьменніка, а 29 сакавіка ў эфіры сацыякультурнага тэлеканала адбудзецца паказ фільма «Спяваюць жаваранкі» (1953 г.) рэжысёра Уладзіміра Корш-Сабліна — таксама па аднайменнай п'есе беларускага класіка.

Абноўленую версію легендарнага спектакля «Паўлінка» Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы гледачам прадставяць у эфіры 27 сакавіка. У праграме «Сузоры» з госцем пісьменніка і журналіста Навума Гальпяровіча, заслужаным артыстам Рэспублікі Беларусь Віктарам Скарабагатавым нас чакае цікавая гутарка пра сучаснае культурнае жыццё. У вячэрнім эфіры 27 сакавіка ў рамках праекта «Тэатр у дэталях» прапануецца расповед пра балет Вячаслава Кузняцова «Анастасія» і сам паказ пастаноўкі ў Вялікім тэатры оперы і балета. А на наступны дзень увазе аўдыторыі будзе прапанаваны прагляд балета Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета кампазітара Андрэя Пятрова «Стварэнне свету» і цікавыя факты пра яго таксама з праграмы «Тэатр у дэталях».

Дарэчы, у хуткім часе скарбніца тэлеверсій беларускіх пастановак папоўніцца спектаклем «Пясняр» сталічнага Драматычнага тэатра імя Максіма Горкага і балетам Вялікага тэатра Беларусі «Баядэрка», а ў канцы сакавіка ў здымачнай групы «Беларусь 3» запланавана творчая камандзіроўка ў Віцебск, дзе на сцэне Коласаўскага тэатра будуць запісаны драмы «Не пакідай мяне...» і «Леаніды не вернуцца на зямлю». Прэм'ерныя паказы спектакляў у тэлеэфіры варта чакаць у ІІ квартале 2021 года.



**Алена ДРАПКО.**

## НА ВЯЛІКДЗЕНЬ — З СЯМ'ЁЙ

**Сустракаць Вялікдзень (адно з самых знакавых свят для хрысціян усяго свету, якое па каталіцкім календары сёлета адзначаецца 4 красавіка) можна будзе дома ў сямейным коле. Белтэлерадыёкампанія ў эфіры двух тэлеканалаў арганізуе для вернікаў прамыя трансляцыі святочных набажэнстваў з Мінскага архікафедральнага касцёла Імя Найсвяцейшай Панны Марыі, а таксама пакажа сакральныя цырымоніі ў Ватыкане і Рыме з удзелам Папы Рымскага Францыска.**

Напярэдадні свята 1 і 2 красавіка — у Вялікі чацвер і Вялікую пятніцу — сацыякультурны канал «Беларусь 3» у 19.00 запрашае да прагляду набажэнстваў Святога Велікоднага Трыдзенства, якія ў пятнічным эфіры працягнуцца паказам хрэснага шляху з рымскага Калізея ў 23.35.

А 3 красавіка на тэлеканале «Беларусь 1» у 21.45 адбудзецца жывая трансляцыя набажэнства на Светлае Хрыстова Уваскрэсенне і 4 красавіка велікодная раніца пачнецца са Слова біскупа Казіміра Велікасельца. Таксама ў Вялікдзень у 16.30 на «Беларусь 3» будзе паказана Пасланне і Блаславенне «Гораду і Свету» з Ватыкана.


## «На прыроду са «Звяздой»



Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на ІІ квартал або І паўгоддзе 2021 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 12 красавіка 2021 года ў рэдакцыю на адрас: вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, г. Мінск.

**7.05, 8.50, 9.40, 11.00, 15.40, 17.00, 21.40, 23.00** Музычная настальгія (12+).
**7.15, 13.20** Тэлеспектакль «Тры сястры» (16+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**12.00** «Эліта Краіны Саветаў». Алег Анофрыеў (16+).
**12.55** Фільм-канцэрт «Перад далёкай дарогай» (12+).
**18.00** «Сяем, сябры!» (12+)
**19.00** Маст. фільм «Небяспечны ўзрост» (16+).
**20.30** Фільм-канцэрт «Рытм, рытм, рытм» (12+).
**23.20** Дак. фільм «Руса турыста. Упершыню за мяжой» (Замежныя камандзіроўкі) (16+).
**0.00** «Народжаныя ў СССР». Лепшае (16+).
**0.55** «Аншлаг? Аншлаг!» (16+)
**2.10** Кінаканцэрт «На біс» (12+).
**3.45** Фільм-спектакль «Сыходзячы, азірніся...» (16+).

## EuroSport 1

**0.30, 11.00** Снукер. «Мастэрс» (6+).
**2.30, 8.30** Веласпорт. «Вуэльта Каталоніі» (12+).
**4.00, 7.00, 18.30, 20.30** Горныя лыжы. Кубак свету (12+).
**6.00, 19.30** Горныя лыжы. Чэмпіянат свету (12+).
**14.00** Веласпорт. Парыж — Ніца (12+).
**15.00** Веласпорт. Тырэна — Адрыятыка (12+).
**15.45, 21.30** Веласпорт. Тур Сіцыліі (12+).
**17.30** Веласпорт. Кубак Альфрэда Бінды (12+).
**22.30** Веласпорт. Сусветны тур (12+).
**23.30** Веласпорт. Лепшае з Фландрыі (12+).

## Кінакамедыя

**1.25** Чалавек, які занадта мала ведаў (16+).
**3.05** Самка (16+).
**4.35** Ніндзя з Беверлі Хілз (12+).
**6.05** Дзевяць ярдаў (16+).
**8.00** Тачка на мільён (18+).
**10.05** Васабі (16+).



**11.50** Эвалюцыя (12+).
**13.45** Першая дачка (12+).
**15.40** Шпіён, які мяне кінуў (16+).
**17.50** Выдатніца лёгкіх паводзінаў (16+).
**19.30** Мільянер па няволі (12+).
**21.15** Пяць нявест (16+).
**23.15** Крывёю і потам: анаболікі (16+).

## ТБ3

**6.00** Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**9.45** «Перыскоп» (16+).
**10.05, 16.00, 4.30** «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).
**11.05** «Паралельны свет» (12+).
**12.05, 18.40, 2.50** «Сляпая» (16+).
**13.15, 19.50** «Варажбітка» (12+).
**14.25, 3.45** «Містычныя гісторыі» (12+).
**15.25** «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
**17.05** «Знакі лёсу» (16+).
**17.40** «Паралельны свет» (12+).
**21.00** «Следства па целе». Серыял (16+).
**22.50** «Грым». Серыял (16+).
**23.45** «Глядзі сам» (16+).
**0.00** «10 самых» (16+).
**0.35** «Лінія абароны» (16+).
**1.10** «Бітва тытанаў». Маст. фільм (12+).

## ТБ1000

**5.00, 17.15** Доктар Хаус (16+).
**6.40** Іншыя (16+).
**8.35** Прывід дома на ўзгорку (16+).
**10.35** Прыцэмкі (16+).
**12.45** Прыцэмкі. Сага. Маладзік (12+).
**15.05** Прыцэмкі. Сага. Зацьменне (16+).
**19.00** Гульня ў хованкі (16+).
**20.50** Таленавіты містар Рыплі (16+).
**23.25** Разумніца Уіл Хантынг (16+).
**1.35** Прыцэмкі. Сага. Світанне: частка 1-я (12+).
**3.20** Прыцэмкі. Сага. Світанне: частка 2-я (12+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**5.35** Алёша Паповіч і Тугарын Змей (12+).
**7.15, 16.15** Ілья Мурамец і Салавей-Разбойнік (6+).
**9.15** Лёд (12+).
**11.15** Лёд-2 (6+).
**13.55, 19.00** Чорныя кошкі (16+).
**17.45** Дабрыня Мікіціч і Змей Гарыныч (6+).
**20.45** Адзін удых (12+).
**22.35** Палі! (12+)
**0.20** Палюбоўніцы (16+).
**2.05** Няўлоўныя: Бангкок (16+).
**3.50** Няўлоўныя: Джэкпот (16+).

## National Geographic

**6.00** Зрабіць за адзін дзень (16+).
**6.20** Навуковыя глупствы (16+).
**6.45** Гульні розуму (16+).
**7.35** Машыны: разабраць і прадаць (16+).
**8.25** У дзікай прыродзе з Беарам Грылсам (16+).
**9.15** Сапраўдны суперкар (16+).
**10.05, 13.30, 22.40, 1.10** Аўта-SOS (16+).
**11.45** Дзікі тунец (16+).
**12.40, 16.50** Наркавойны (16+).
**14.20, 23.30** Ліхтугі за мяжой (16+).
**15.10, 19.15, 0.20** Расследаванні авіякатастроф (16+).
**16.00** Служба бяспекі аэрапорта: Бразілія і Перу (16+).
**17.40** Падарожжы з Гордана Рамзі (16+).
**18.30** Фабрыка ежы (16+).
**21.00, 2.40** Аляска: новае пакаленне (16+).
**21.50** Востраў бунтароў (16+).
**3.30** Асушыць акіян (16+).
**5.10** Цуды інжынерыі (16+).

## Discovery

**8.00, 23.06** Сталёвыя хлопцы (12+).
**8.46, 11.25, 16.48, 22.12** Махінатары (12+).
**9.39, 20.24, 5.45** Паляўнічыя на старызну (12+).
**10.32, 15.00, 21.18** Як гэта зроблена? (12+)
**12.18, 6.30** Апошнія таямніцы далiны Цароў (12+).
**14.06, 0.00** Голыя і напалоханыя XL (16+).
**15.54, 1.47** Музейныя загадкі (16+).
**17.42** Бітвы за кантэйнеры (12+).
**18.36** Смяротны ўлоў (16+).
**19.30, 4.15** Мяцежны гараж (16+).
**2.40** Рэальныя дальнабойшчыкі (12+).
**5.00** Як гэта ўладкавана? (12+).

# Абарона па ўсіх кірунках

## Якую сумесную заяву разглядалі парламентарыі па падтрыманні калектыўнай бяспекі?

**ДНЯМІ адбылося пазачарговае пасяджэнне Пастаяннай камісіі Парламенцкай Асамблеі Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы па палітычных пытаннях і міжнародным супрацоўніцтве. Парламентарыі сустрэліся ў фармаце відэаканферэнцыі і абмеркавалі праект заявы Савета ПА АДКБ аб недапушчальнасці замежнага ўмяшання ў выбарчыя працэсы краін — членаў арганізацыі.**

Як адзначыў **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі ПА АДКБ, намеснік старшыні камітэта Дзяржаўнай думы Федэральнага сходу Расійскай Федэрацыі па міжнародных справах Дзмітрый НОВІКАЎ**, выбары, якія адбыліся ў дзяржавах — членах АДКБ, прадэманстравалі сталасць і ўстойлівасць выбарчых сістэм, вольны, адкрыты, канкурэнтны характар выбараў, што адпавядае нацыянальнаму заканадаўству, агульнапрынятым універсальным і рэгіянальным міжнародным абавязацельствам у гэтай галіне.

> Грубае парушэнне асноўных дэмакратычных прынцыпаў і свабод у глабальных інфармацыйных сетках патрабуе адэкватнай ацэнкі з боку міжнародных, у тым ліку парламенцкіх, арганізацый.

У той жа час, нагадаў выступоўца, падчас выбараў назіралася прамое і ўскоснае знешняе ўмяшанне, якое мела на мэце паставіць пад сумненне іх дэмакратычны характар і праявілася, у прыватнасці, у неаб'ектыўнай ацэнцы працэсаў, што адбыліся, і шырокім выкарыстанні сацсетак, відэахостынгаў і іншых сродкаў масавай камунікацыі для сістэмных інфармацыйных укідаў, накіраваных на расслаенне і палярызацыю грамадства і правакуючых электарат на радыкальныя дзеянні.

Асаблівую заклапочанасць, падкрэсліў парламентарый, выклікае ўмяшанне ў нацыянальныя выбарчыя працэсы дзяржаў — членаў АДКБ афіцыйных прадстаўнікоў шэрагу замежных дзяржаў. Пры гэтым дзяржавы, якія выкарыстоўваюць такія метады, прытрымліваюцца двайных стандартаў і, як правіла, у іх саміх адзначаюцца сур'ёзныя праблемы з арганізацыяй і правядзеннем выбараў. Такія дзяржавы і іх прадстаўнікі не маюць права ўмешвацца ў выбарчыя працэсы, тым больш навязваць якіясьці патрабаванні дзяржавам — членам Арганізацыі па іх ажыццяўленні.

«Вялікую небяспеку ўяўляюць сабой кіруемыя з-за мяжы інфармацыйныя рэсурсы, сацыяльныя сеткі і відэахостынгі, якія, як паказала практыка, ажыццяўляюць палітычную цэнзуру анлайн-кантэнту без рашэння суда ці іншых упаўнаважаных органаў, — гаворыцца ў заяве. — Лічым такую антыдэмакратычную практыку прамой пагрозай суверэнітэту і нацыянальнай бяспецы дзяржаў — членаў АДКБ».

Парламентарыі рашуча заяўляюць аб недапушчальнасці ўмяшання ва ўнутраныя справы дзяржаў — членаў Арганізацыі і неабходнасці прыняцця мер па ўзмацненні нацыянальнага нагляду за замежнымі інфармацыйнымі рэсурсамі. Яны перакананыя, што грубае парушэнне асноўных дэмакратычных прынцыпаў і свабод у глабальных інфармацыйных сетках патрабуе адэкватнай ацэнкі з боку міжнародных, у тым ліку парламенцкіх, арганізацый.



— Нацыянальная бяспека — гэта найважнейшы пастулат развіцця суверэннай беларускай дзяржавы, — падкрэсліла ў гутарцы з журналістамі **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Лілія АНАНІЧ.** — Нацыянальная бяспека заўсёды была ў абаронай сферы, але сёння я зрабіла б акцэнт на інфармацыйную сферу: на тыя метады і формы гібрыдных войнаў, якія суправаджаюцца масіраванымі інфармацыйнымі атакамі. Таму сёння ў нашай краіны ёсць вялікі вопыт і дакладнае бачанне таго, як абараніць нашу краіну ад замахаў у любой сферы.

Салідарны з калегай і **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАЧКОЎ.** Ён звярнуў увагу на тое, што падчас мінулых выбараў, якія адбыліся ў нашай краіне, Казахстане, Кыргызстане, адзначалася ўмяшанне асобных замежных дзяржаў і іх прадстаўнікоў у выбарчыя працэсы.

— Мы лічым такія падыходы недапушчальнымі, — падкрэсліў ён. — Асабліва недапушчальна тое, што гэтымі структурамі актыўна выкарыстоўваюцца інфармацыйныя рэсурсы, сацыяльныя сеткі для таго, каб стварыць атмасферу і пераканаць (у першую чаргу) замежную грамадскасць аб недэмакратычным характары выбарчых сістэм у нашых краінах. Мы катэгарычна адмаўляем такія падыходы.

Парламентарый растлумачыў, што сёння гаворка не ідзе аб выпрацоўцы нейкіх мер, хутчэй — аб выказванні занепакоенасці тым, што назіралі ў 2020 годзе, у пачатку 2021-га.

— Мы рыхтуем заяву, што будзе разглядацца Саветам Парламенцкай Асамблеі АДКБ у канцы сакавіка, пасяджэнне якой адбудзецца ў Душанбэ, — расказаў Сяргей Рачкоў. — Я перакананы, што кіраўнікі і парламенцкія дэлегацыі, якія будуць удзельнічаць у пасяджэнні Савета ПА АДКБ, разгледзяць гэтую заяву і таксама абмяркуюць магчымыя меры супрацьдзеяння такім з'явам.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

РАЗГЛЕДЖАНА НА СЕСІІ

# ШТО ХВАЛЮЕ МІНЧАН?

**НА 25-й чарговай сесіі Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў разгледзелі 14 пытанняў і прынялі шэраг важных гаспадарчых рашэнняў. Але пачалася сесія з абмеркавання рэалізацыі наказаў.**

Калі больш дакладна, то з аналізу вынікаў дзейнасці дэпутацкага корпуса па выкананні мерапрыемстваў у мінулым годзе па праблемных пытаннях і наказах, якія выказалі жыхары сталіцы яшчэ тагачасным кандыдатам у дэпутаты Мінскага гарадскога Савета 28-га склікання падчас перадвыбарнай кампаніі. З разгляду менавіта пытання, што, бадай, для гарсавета з'яўляецца ў пэўным сэнсе базавым — непасрэдная і пастаянная работа з людзьмі, выніковасць якой часта наўпрост і ўскосна ўплывае на стабільнасць сацыяльна-эканамічнай сітуацыі ў сталіцы краіны.

**Старшыня Пастаяннай камісіі гарсавета па галоснасці, самакіраванні і правапарадку Раман НІКАНАЎ** агучыў наступныя лічбы. Летась дэпутаты правялі больш за 1300 асабістых прыёмаў і тэлефонных ліній, падчас якіх прынялі каля 1800 выбаршчыкаў, арганізавалі амаль тысячу сустрэч з мінчанамі па месцы іх жыхарства і ў арганізацыях. Былі зроблены 92 справаздачы перад выбаршчыкамі. Выступоўца адзначыў, што ў цэнтры ўвагі дэпутатаў пастаянна знаходзяцца найбольш вострыя пытанні, з якімі звяртаюцца выбаршчыкі. Самай праблемнай сферай летась па-ранейшаму былі хібы ў вядзенні жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Звароты па гэтую тэму склалі 32 % ад агульнай колькасці. Далей ідзе прававая тэматыка — 14 %, затым — пытанні забеспячэння жыллём і праблемы яго будаўніцтва, выплаты пенсій, па скарачэннях і незаконным звальненні.

Сабраць наказы — гэта толькі палова справы і, дарэчы, далёка не самая цяжкая яе частка. Куды больш складана ў тэрмін рэалізаваць пажаданні і патрабаванні мінчан. І тут не заўсёды ўсё атрымліваецца гладка, менавіта так, як планавалася. На сесіі нават узнікла невялікая дыскусія з абмеркаваннем канкрэтных прыкладаў на тэму: ад чаго залежыць своечасовасць і аператыўнасць выканання наказаў? Ад настойлівасці, упартасці, мэтакіраванасці дэпутата? У значнай ступені так. Але нярэдка наказ застаецца нявыкананы з-за адсутнасці элементарнага фінансавання, часта і не вельмі значнага ў маштабах Мінска. Узнікае непрыемная для абодвух бакоў бюракратычная цяганіна.

І ўжо зусім непрыемна, недапушчальна, калі, на погляд шэрагу дэпутатаў, наказы выбаршчыкаў транзітам пераходзяць з аднаго склікання гарадскога Савета ў наступны. У сувязі з гэтым Пастаянная камісія па галоснасці, самакіраванні і правапарадку прыняла рашэнне накіроўваць у профільныя ведамствы краіны інфармацыю аб нявыкананых наказах з несур'ёзных прычын, каб там здолелі выдаткаваць неабходныя сродкі. Дапаможа такі падыход? Час пакажа. Мы потым раскажам у «МС».

Як адзін са шляхоў папярэджання прычын узнікнення скаргаў і розных пытанняў, а потым зваротаў і наказаў, на сесіі прагучала думка і аб тым, што дэпутатам трэба ўдасканальваць сваю дзейнасць у выбарчых акругах. У прыватнасці, часцей сустракацца з жыхарамі сталіцы. Такі падыход дазволіць больш хутка даведвацца аб праблемах, што хвалююць людзей, якія вывучаць непасрэднае меркаванне грамадзян. З гэтай нагоды была выказана прапанова больш актыўна праводзіць «Дні дэпутата» ў раёнах сталіцы, запрашаць да ўдзелу ў іх членаў Савета Рэспублікі і Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, абраных ад Мінска. Гэта дазволіць ім чуць меркаванне грамадзян з першых вуснаў.

**Дэпутаты Мінгарсавета таксама ўнеслі змяненні ў бюджэт сталіцы. Паводле слоў намесніка начальніка галоўнага фінансавага ўпраўлення Мінгарвыканкама Сяргея БУРАЧЭЎСКАГА,** пераразмеркаванне сродкаў звязана з зацвярджэннем дзяржаўных праграм на 2021—2025 гады, а таксама з наяўнасцю рэшткаў сродкаў па стане на 1 студзеня 2021-га. У прыватнасці, дадатковыя сродкі плануецца накіраваць на санітарнае ўтрыманне прыдамовых тэрыторый, на прафілактыку і зніжэнне распаўсюджвання вострых рэспіраторных інфекцый, на азеляненне тэрыторый уздоўж МКАД, на набыццё малагабарытнай спецыяльнай тэхнікі для прадпрыемстваў «Мінскзеленбуда», на бягучы рамонт вулічна-дарожнай сеткі і гэтак далей.

Акрамя таго, за кошт пераразмеркавання асігнаванняў з аб'ектаў капітальнага рамонту мяркуецца павялічыць аб'ём фінансавання інвестыцыйнай праграмы Мінска на 2021 год. У тым ліку накіраваць сродкі на праектаванне і будаўніцтва інжынернай інфраструктуры да жылых дамоў, якія будуюцца па праспекце Незалежнасці і вуліцы Герояў 120-й дывізіі, на набыццё вагонаў электробусаў.

> Зусім непрыемна, недапушчальна, калі, на погляд шэрагу дэпутатаў, наказы выбаршчыкаў транзітам пераходзяць з аднаго склікання гарадскога Савета ў наступны.

Дэпутаты таксама заслухалі справаздачу Прэзідыума і старшыні Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Андрэя Бугрова, зацвердзілі план дзеянняў на бягучы год па навядзенні парадку на тэрыторыі Мінска, рэгіянальны комплекс мерапрыемстваў па рэалізацыі дзяржпраграмы па ахове навакольнага асяроддзя і ўстойлівым выкарыстанні прыродных рэсурсаў, далі згоду на стыпендыі для шэрагу спартсменаў.

**Леанід ТУГАРЫН.**

ПРАБЛЕМА І РАШЭННЕ

# Грошы на грамадскія ініцыятывы

## Іх рэалізацыя павінна падтрымлівацца таксама і за бюджэтныя сродкі

**ПЕРАДГІСТОРЫЯ пытання наступная. На шостым Усебеларускім народным сходзе атрымала падтрымку прапанова Савета Рэспублікі і Маладзёжнага савета (парламента) аб з'яўленні сістэмы падтрымкі стваральных ініцыятыў грамадзянскай супольнасці, накіраваных на вырашэнне канкрэтных сацыяльна-эканамічных праблем, павышэнне якасці жыцця людзей, садзейнічанне найбольш поўнаму раскрыццю творчага патэнцыялу моладзі.**

— У бягучым годзе фінансаваць такія праекты ўяўляецца мэтазгодным за кошт рэсурсаў Банка развіцця Рэспублікі Беларусь. У рамках аказання спонсарскай дапамогі Банк можа даць сродкі як мясцовым органам улады, так і, напрыклад, рэспубліканскаму саюзу грамадскіх аб'яднанняў «Беларускі камітэт маладзёжных арганізацый», які знаходзіцца пад патранажам Міністэрства адукацыі, — адзначыла **старшыня Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Савета Рэспублікі Таццяна РУНЕЦ.**

Разам з тым сенатар звярнула ўвагу на тое, што рэалізацыя грамадзянскіх ініцыятыў павінна непасрэдна падтрымлівацца і за кошт бюджэтных сродкаў. Таму пачынаючы з 2022 года прапануецца распрацаваць механізм фінансавання праектаў, які прадугледжвае ў тым ліку выдзяленне сродкаў з рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў, і надаць яму належны прававы статус. Для гэтага, кажа старшыня профільнай камісіі, спатрэбіцца карэкціроўка законаў «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні ў Рэспубліцы Беларусь», «Аб асновах дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі», «Аб дзяржаўнай падтрымцы маладзёжных і дзіцячых грамадскіх аб'яднанняў у Рэспубліцы Беларусь», іншых актаў заканадаўства.

Са свайго боку Савет Рэспублікі гатовы забяспечыць каардынацыю гэтай дзейнасці.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

# Акцэнт на шматгадовыя расліны

**У найбліжэйшыя тыдні ў Мінску пройдзе каля 50 акцый па навядзенні парадку на гарадскіх тэрыторыях з адначасовай пасадкай дрэў, кустоў і кветак.**

Як паведамілі ў «Мінскзелянбудзе», запланаваны акцыі па закладцы алей, прымеркаваных да Года народнага адзінства, алей сямейных дрэў, прыборцы тэрыторый, добраўпарадкаванні цяжкадаступных зарослых месцаў на берагах водных аб'ектаў сталіцы з уладкаваннем там зон адпачынку.

Таксама запланаваны рамонт і афарбоўка каля сямі тысяч малых архітэктурных формаў, аднаўленне пасля зімы дарожак і газонаў, пасадка дзевяці тысяч дрэў і 34 тысяч дэкаратыўных кустоў.

У кветкавым афармленні сталіцы акцэнт будзе зроблены на кампазіцыях са шматгадовых раслін, якія пастаянна захоўваюць дэкаратыўны выгляд і будуць радаваць вока амаль круглы год. Такія расліны высадзяць на плошчы 3,5 тысячы квадратных метраў. У выніку атрымаецца сэканоміць больш за 180 тысяч саджанцаў летніх кветак.

Паводле слоў старшыні Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Андрэя Бугрова, у акцыях па прыборцы тэрыторый і пасадцы дрэў разам з выбаршчыкамі актыўны ўдзел мяркуюць узяць і дэпутаты гарсавета.

**Леанід ТУГАРЫН.**

ГОД НАРОДНАГА АДЗІНСТВА

# ТРАГЕДЫЯ ЎСІХ АБ'ЯДНАЛА

## У Магілёўскім раёне адраджаюць памяць ахвяр Вялікай Айчыннай вайны

**У Вендаражскім сельсавеце ёсць дзве невялічкія вёсачкі — Завярэжжа і Варатыншчына, дзе да вайны мірна суіснавалі беларусы і яўрэі. Падчас карных аперацый яўрэйскае насельніцтва было амаль цалкам знішчана. Выратаваліся адзінкі. Сёння пра тыя жахлівыя падзеі нагадваюць могілкі паміж вёскамі. Летась вакол іх з'явілася новая агароджа і стэнд з інфармацыяй. Пра гэта паклапаціўся праект Еўрапейскай ініцыятывы па ахове яўрэйскіх могілак. А нядаўна прадстаўнікі Магілёўскай яўрэйскай суполкі Аляксандр ЛІЦІН і Іда ШАНДАРОВІЧ сустрэліся з жыхарамі аграгарадка Вендараж, каб расказаць пра гісторыю гэтых мястэчак. Сустрэча адбылася ў тутэйшай школе.**



Магілёўскія краязнаўцы расказалі пра трагічны лёс вёсак Завярэжжа і Варатыншчына.

### З архіўных крыніц

Магілёўскія краязнаўцы зрабілі цікавую прэзентацыю, каб наглядна прасачыць трагічны лёс гэтых вёсак. У 1835 годзе на беразе ракі Жыварэзка ў 20 кіламетрах ад Магілёва была заснавана сельскагаспадарчая яўрэйская калонія, якая хутка атрымала назву Завярэжжа. Там пражывала 259 яўрэяў, але з часам да іх далучыліся і беларускія сем'і. У 30-я гады мінулага стагоддзя, па ўспамінах месцічаў, тут налічвалася 40-45 дамоў, з якіх 35-40 былі яўрэйскія. У вёсцы Варатыншчына па суседстве таксама жылі яўрэі, але там іх была меншасць. Жыццё было беднае, але зусім не сумнае. Разам працавалі на зямлі, вырошчвалі ўраджай, гадавалі дзетак, дапамагалі адзін аднаму. Усё змянілася 12 верасня 1941 года, калі атрад нацыстаў увайшоў у вёску Завярэжжа і захапіў 97 мірных жыхароў — жанчын, старых, дзяцей. Усіх іх пагналі ў бок вёскі Карчомка. На ўскрайку лесу людзей прымусілі капаць ямы, а потым усіх расстралялі і закапалі. У 1942 годзе такі ж лёс напаткаў жыхароў вёскі Варатыншчына. На месцы могілак у савецкі час быў устаноўлены помнік. На жаль, сёння пахаванні знаходзяцца ў занядбанні. І тое, што зроблена пры дапамозе Еўрапейскай ініцыятывы па ахове яўрэйскіх могілак, вельмі каштоўна. «Гэта месцы народнай памяці, якія патрабуюць дастойных, паважлівых адносін і выхавання», — падкрэсліла Іда Шандаровіч.

— Каб аднавіць падзеі тых далёкіх часоў, прыйшлося шмат працаваць у беларускіх і ізраільскіх архівах, — адзначыў Аляксандр Ліцін. — Інфармацыю збіралі па крупінках. Нешта падказалі мясцовыя жыхары. Але старажылаў ужо амаль не засталося.

Асаблівае месца ў гэтай гісторыі адводзіцца праведнікам, якія, рызыкуючы жыццём, ратавалі яўрэйскіх дзяцей — Нёму Асяноўскага і Барыса Шуфрына.

— Пра гэтыя факты нам расказалі старажылы — Надзея Сцяпанаўна Лемяшко, у дзявоцтве Бякшэева, і Любоў Васілеўна Харкевіч, — удакладніла Іда Шандаровіч. — На жаль, усё скончылася для дабрадзеяў трагічна. Алену Копцаву, якая хавала хлопчыка Нёму з Завярэжжа, паліцаі прывязалі валасамі да хваста каня і пагналі яго наўскач. Хлопчыка таксама забілі. Нейкі здраднік данёс на жанчыну.

### Сцяна памяці

Вендаражскі дзіцячы сад — школа на працягу апошніх двух гадоў цесна займаецца ваеннай тэмай. У рамках акцыі «Беларусь памятае» быў сабраны багаты матэрыял аб продках вучняў. На гэтую тэму напісана шмат даследчых работ, а ў двары школы з'явілася своеасаблівая памятная сцяна, на якой размешчаны звесткі пра гераічных прадзедаў. А яшчэ настаўнікі разам са школьнікамі зрабілі каля школы памятную зорку ў гонар тых, хто не вярнуўся з вайны. Ахвяры халакосту — асаблівая старонка ў гісторыі сельсавета.

— Ад аграгарадка да гэтых вёсак усяго некалькі кіламетраў, — удакладняе **дырэктар Вендаражскага ВПК «Дзіцячы сад — школа» Вячаслаў АРЛОЎСКІ.** — Дзяцей адтуль на занятку прывозіць наш школьны аўтобус. Цяпер там жыве няшмат людзей. А да вайны гэта былі дастаткова вялікія вёскі. На лёс іх жыхароў выпалі нечалавечыя выпрабаванні.



Могілкі паміж вёскамі сёння нагадваюць пра тыя жахлівыя падзеі.

Вячаслаў Валянцінавіч лічыць, што трагічная старонка ў жыцці беларускага народа здольная згуртаваць людзей. І пра гэта вельмі важна нагадваць у Год народнага адзінства.

— Беларусь заўсёды славілася традыцыямі добрага, паважлівага стаўлення да людзей розных нацыянальнасцяў і веравызнанняў, — кажа ён. — Гэтыя традыцыі неабходна прывіваць нашай моладзі. Падрастаючае пакаленне павінна ведаць гісторыю роднай зямлі, шанаваць яе і захоўваць. Важна фарміраваць у нашых юнакоў і дзяўчат гістарычную памяць, міласэрнасць і талерантнасць, непрымірымасць да ўсяго амаральнага — ваенных злачынстваў, расізму і нацызму.

Такой думкі прытрымліваецца і **старшыня Вендаражскага сельсавета Міхаіл ВАСІЛЕНКА.** На новай пасадзе ён усяго некалькі дзён, але добра ведае раён, бо родам з гэтых мясцін.

— Мы павінны адраджаць і захоўваць гісторыю мінулых часоў, часцей нагадваць моладзі пра тое, што такое наша спадчына, — лічыць ён. — Самае святое і недакранальнае ў ёй — памяць пра Вялікую Айчынную вайну, нашых гераічных дзядоў і прадзедаў. На тэрыторыі нашага раёна 19 пахаванняў перыяду Вялікай Айчыннай вайны. У іх — людзі розных нацыянальнасцяў. Фашызм не шкадаваў нікога, ні яўрэяў, ні беларусаў. У Магілёўскім раёне была цалкам знішчана вёска Дубінка. Немцы спалілі жывымі амаль усіх яе 200 жыхароў. Ад расказаў ацалелай у тым пекле жанчыны, якая на той момант была шасцігадовай дзяўчынкай, стыне кроў. Вось пра гэта і трэба нагадваць нашым дзецям, каб трагедыя не паўтарылася.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
Газета для выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых саветаў

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ.**

Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 26 сакавіка 2021 года.

# ПАДМАН ЦІ МАНІПУЛЯЦЫЯ

## Якія «шчыліны» знаходзяць арганізатары прэзентацый, каб пазбегнуць скасавання дагавора куплі-продажу

**Здаецца, многія чулі і ведаюць нямала гісторый аб недарэчных пакупніках. Прыходзіць такі чалавек на прэзентацыю якога-небудзь тавару, купляе яго, а потым шкадуе аб гэтым. Вось толькі вярнуць тавар становіцца ўсё складаней. Прадаўцы стараюцца прадугледзець усе магчымыя рызыкі, каб не пакінуць пакупніку ніякіх шанцаў, нават у судзе.**

### ПРЫЙШОЎ, УБАЧЫЎ І КУПІЎ...

У судзе Кастрычніцкага раёна Гродна нямала такіх гісторый, заначае **суддзя Сяргей СЛАШЧОЎ.** І нельга сказаць, што іх колькасць мае тэндэнцыю да зніжэння. Хутчэй, наадварот. Толькі за мінулы год па прэзентацыях у раённым судзе абласнога цэнтра было каля двух дзясятаў іскаў.

Вось адзін з іх. Патэнцыяльны пакупнік, якому крыху больш за 50 — назавём яго Іванам Пятровічам — прыйшоў на прэзентацыю адной брэсцкай фірмы па арэндаванай імі плошчы. Там ён зацікавіўся цудадзейнымі якасцямі тавару, у прыватнасці электрычнай масажнай накідкай, якая здымае цэлае кола хвароб. І так яму гэты тавар спадабаўся, што нават цана не спалохала. А яна нічога сабе — чатыры тысячы рублёў. Але вось недарэчнасць! Не было ў Івана Пятровіча такіх грошай. Але ў фірме пайшлі насустрач і афармілі крэдытны дагавор на тры гады.

Здаецца, абодва бакі задаволены. І ўсё ж справа гэтая дайшла да суда. Аказалася, што Івану Пятровічу масажная накідка наогул не патрэбна, тым больш за такія грошы. Праўда, ён зразумеў гэта пазней, калі прыйшоў дамоў, сеў і падумаў. Дакладней, выслухаў жонку. Яна і прыняла яго да розуму. Кінуўся Іван Пятровіч шукаць тую фірму, спрабаваў звязацца па тэлефонах, што пазначаны ў дагаворы. Але прадаўцы не пайшлі насустрач мужчыне і грошы вяртаць не збіраліся. Маўляў, тавар тэхнічна складаны, таму яго вярнуць назад нельга. Ён якасны, спраўны. Прададзены па ўсіх правілах. Здаецца, у Івана Пятровіча ніякіх шанцаў. Каму прад'яўляць прэтэнзіі, калі ты сам заключыў дагавор...

### «ТОНКІ» ПАДЫХОД

Дык чаму многія вядуцца на такія спакусы? Здаецца, і тавар прадаецца па высокіх цэнах, і ўпэўненасці няма, што ён патрэбны, а чалавек усё роўна купляе. Хоць у якой-небудзь краме прайшоў бы міма, і нават не спыніўся. Магчыма, справа ў кантактнай форме гандлю.

Чалавека асабіста запрашаюць на прэзентацыю. Як правіла, па тэлефоне, прыемны голас не проста выкладае інфармацыю, а імкнецца наладзіць дыялог, абавязкова цікавіцца, як завуць, і звяртаецца потым выключна па імені. Пры гэтым званкі могуць паступаць як на хатні, так і на мабільны тэлефон. І кола адрасатаў надзвычай шырокае. Неадночы такія званкі паступалі і на мой тэлефон, праўда, толькі на хатні. А вось мой суразмоўца атрымліваў такія прапановы па мабільніку.

— І да мяне таксама часта тэлефануюць, я ўжо стаміўся адбівацца ад гэтых званкоў. Але адразу спыняю гэты маналог, — зазначае Сяргей Слашчоў. — Магчыма, не ўсе так паступаюць, некаторыя вядуцца на перспектыву атрымаць падарункі і бонусы, якія на тым канцы праводу ім прапануюць.

У ходзе судовага разгляду становіцца відавочным, як чалавек трапляе ў залежнасць ад прадаўца. Акцэнт пераважна робіцца на больш узроставую катэгорыю. Такіх людзей лягчэй угаварыць, запэўніць. Калі потым многія сітуацыю аналізуюць, бачаць, што атрымалі не бонус, а развод. Бо такі ж тавар у іншых крыніцах значна таннейшы.

Вось толькі падчас самой прэзентацыі такой думкі не ўзнікае. І гэта зразумела. Перад вачыма — сапраўднае шоу, чалавек атрымлівае падарункі, узнікае адчуванне клопату аб пакупніку. І ён лічыць сябе нібыта абавязаны прадаўцу. Ну як жа? Табе аддалі столькі часу, усё растлумачылі, паказалі і расказалі. Запэўнілі, наколькі гэты тавар патрэбны. Ілюзія яшчэ і ў тым, што з чалавека не патрабуюць усю суму адразу, а прапануюць афарміць крэдыт, які будзе пагашацца часткамі. Звычайна на некалькі гадоў. Ну як тут не пайсці насустрач і нічога не купіць? Заўсёды знаходзяцца людзі, якія гэты тавар купяць.

— Калі потым у судзе дапытваешся, навошта вы куплялі гэты тавар, калі ён вам не патрэбны, чалавек паціскае плячыма і нічога не можа патлумачыць. Гэта першая рэакцыя. Маўляў, пераканалі. А некаторыя сцвярджаюць, што прымусілі. Вядома, з дапамогай адваката чалавек больш грунтоўна тлумачыць свае дзеянні, — расказвае суддзя.

Ва ўсялякім выпадку, чалавек перакананы, што тавар не патрэбны і настойвае на тым, каб скасаваць дагавор і вярнуць грошы. Але ці заўсёды гэта ўдаецца зрабіць? Як аказалася, не так усё проста.

### ВЫЙСЦЕ З ЛАБІРЫНТА

Нашаму Івану Пятровічу пашанцавала: яму ўдалося скасаваць дагавор куплі-продажу. Памятаеце, мужчына купіў на прэзентацыі масажную накідку? Ён звярнуўся ў суд з правільна складзенай іскавай заявай. Спасылка была на тое, што тавар прадавалі без указання даты вытворчасці, а закон патрабуе, каб дата была ўказана. А паколькі такую інфармацыю ў фірме не змаглі пацвердзіць, Іван Пятровіч суд выйграў. Дагавор куплі-продажу быў скасаваны. Але гэта толькі паўсправы. Бо застаўся крэдытны дагавор, плацяжы па якім працягваліся.

— Паколькі фірма была прыезджая, мужчына адправіў тавар па пошце. Фірма тавар не атрымала і вяртаць грошы па крэдытным дагаворы не стала. Гісторыя доўжылася некалькі месяцаў. Быў складзены новы іск аб скасаванні крэдытнага дагавора. І ўсё ж частка плацяжоў пакуль не вернута, і ў гэтым суду яшчэ трэба будзе разабрацца.

Як бачым, вярнуць тавар не так і проста. Для пакупніка аказалася спрыяльным, што на тавары не ўказана дата выпуску, і гэты факт аказаўся вырашальным. А калі б такая была? Доказаць сваю праўду было б складана. І суду засталося б толькі адно — адмовіць у іску...

Гэта што датычыцца масажных накідак ці масажных матрацаў, якія зараз папулярныя на прэзентацыях. З посудам прасцей, бо гэты тавар можна вярнуць на працягу 14 дзён. Але тут важна ўклася ў тэрмін. Бо калі тавар ляжыць доўга, вярнуць яго складана. Трэба шукаць нейкія іншыя матывы. Напрыклад, якасць тавару. Альбо вытворцы не заўсёды забяспечваюць тое, што напісана ў дагаворы. І гэта таксама можа стаць падставай для яго скасавання.



— У суд звярнулася жанчына, якая хацела вярнуць посуд, які купіла на прэзентацыі за чатыры тысячы рублёў. А паколькі тэрмін прайшоў, фірма тавар не брала. У судовым іску яна паведаміла, што пад італьянскім брэндам не было звестак аб рэальным вытворцы. А паколькі фірма не дала доказаў, што інфармацыя даведзена да пакупніка, дагавор быў скасаваны, — патлумачыў суразмоўца.

### БАКІ ГАТОВЫ ДА ВЫКЛІКАЎ

Калі тавар быў куплены на выязным гандлі, у пакупніка больш шанцаў яго здаць. А некаторыя тавары наогул нельга прадаваць на выяздзе. Гэта датычыцца тэхнічна складаных тавараў бытавога прызначэння, у тым ліку масажных накідак і масажных матрацаў. Менавіта па іх пачало паступаць найбольш заяў і прэтэнзій.

У сваю чаргу, фірмы таксама шукаюць «шчыліны», каб пазбегнуць судовых спраў. Пасля прыняцця закона аб абмежаваным асартыменце выязнога гандлю яны пачалі афармляць арэнду памяшкання пад сваё прадпрыемства. Праўда, праз некалькі дзён з'язджаюць. Але фармальна тут не падкапацца, бо гэта ўжо і не выязны гандаль. Нарматыўны пакет у поўным парадку. І подпісы пакупнікоў стаяць усюды, дзе патрэбна, — знайсці нейкую недасканаласць амаль немагчыма. У выніку — дагаворы, па якіх плата ў месяц за тавар складае і 50 рублёў, і 100. Але сустракаюцца і вельмі значныя сумы, якія даходзяць да паловы, а то і большай часткі пенсіі пакупніка. І людзі ў роспачы: як ім плаціць?

Па словах суразмоўцы, мінулы год быў самым ураджайным на такія судовыя справы. Магчыма, і таму, што многія фірмы перасталі па першым патрабаванні забіраць тавар назад.

— Тут трэба даць параду, каб людзі ставіліся да гэтага крытычна. Калі ідзеш на такую прэзентацыю, трэба зрабіць сабе ўстаноўку: ты нікому нічога не павінен. Цябе запрасілі, і ты прыйшоў. Прыняў да ўвагі, і на гэтым усё. І галоўнае — не прымаць хуткасных рашэнняў. Сказаць: «Я падумаю, пакіньце кантактны нумар, я параюся з роднымі». Не трэба весціся на ўгаворы, нават калі прапануюць вялікія зніжкі. Ці наогул не ісці на прэзентацыю, калі чалавек не ўпэўнены ў сваёй прывальнасці. Трэба памятаць, што задача такіх прадаўцоў — прадаць тавар, які насамрэч можна купіць значна танней. Прынамсі, у суд звярталіся менавіта тады, калі такі ж тавар бачылі за кошт у 3-4 разы меншы. І трэба ведаць, што не ўсе іскі задавальняюцца, — падсумаваў суразмоўца.

Дарэчы, практычна палова спраў у судзе не даходзіць да вынясення рашэння. Прадаўцы прапануюць вырашыць пытанне мірным пагадненнем. Некаторыя пытанні не даходзяць нават да суда, а вырашаюцца ў грамадскім аб'яднанні спажыўцоў. Дарэчы, роўна год таму было створана аб'яднанне, якое так і называецца: «Таварыства абароны правоў спажыўцоў, падманутых на прэзентацыі». І гэта адна з першых інстанцый, куды часцей за ўсё звяртаюцца такія пакупнікі.

**Дзмітрый КАСЯНКОЎ, старшыня Гродзенскага таварыства абароны правоў спажыўцоў, падманутых на прэзентацыі:**

— Спажывец мае права на працягу 14 дзён вярнуць тавар альбо абмяняць яго на аналагічны іншых памераў, формы, габарыту альбо камплектацыі. У гэтым выпадку прадавец можа зрабіць пераразлік. Таварыства правоў спажыўцоў бясплатна падрыхтуе юрыдычна правільную прэтэнзію прадаўцу і бясплатна будзе прадстаўляць яго інтарэсы ў судзе. Напрыклад, паслугі адваката за такую дапамогу могуць абысціся не ў адну сотню рублёў. Мы заўсёды прыйдзем на дапамогу, каб вярнуць непатрэбны тавар.

На жаль, такі падман не прадугледжаны на заканадаўчым узроўні, і дзеянні фірмаў кваліфікуюцца як маркетынгавы ход ці рэкламная акцыя. Тым не менш грамадскае аб'яднанне не прайграла ніводнага суда. Прадавец альбо вяртаў усю суму за тавар, альбо зніжаў цану і вяртаў астатнія грошы.

Найбольшая складанасць у прад'яўленні прэтэнзіі звязана з прэзентацыйнай работай інтэрнэт-крам. Пакупнік не бачыць тавар падчас набыцця і часта атрымлівае недакладную інфармацыю, што потым цяжка даказаць. Пры гэтым інтэрнэт-крамы існуюць кароткі тэрмін, таму купляць там тавар — усё роўна, што ката ў мяшку.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

## НАБЫВАЕШ — ПРАВЯРАЙ

### Пакупкі праз інтэрнэт, на прэзентацыях і «залатыя» паслугі

Сярод скаргаў, якія трапляюць у Беларускае таварыства абароны правоў спажыўцоў, гэта, бадай што, асноўныя кірункі праблем, з якімі сутыкаюцца беларусы. Атрымаўшы няякасны тавар ці рэч, якая непатрэбна, грамадзяне часта не могуць ні пазбавіцца ад іх, ні вярнуць грошы. **Старшыня Беларускага таварыства абароны спажыўцоў Ганна СУША** абазначыла асноўныя памылкі, якіх варта не дапускаць, калі набываеш тавары праз інтэрнэт, у тым ліку небяспечную электратэхнічную прадукцыю:

*— Пакупнікі не заўжды глядзяць, на якой пляцоўцы (дамене) набыты тавар. А гэта важна, бо калі яны купілі няякасны тавар або якасны, але які па нейкіх прычынах не падышоў, і яго можна было б вярнуць на працягу 14 дзён, то гэта ў пэўных выпадках будзе цяжка зрабіць. Яшчэ адна праблема — пры дастаўцы часта не правяраюць працаздольнасць тавару, не патрабуюць дакумента, які пацвярджае факт пакупкі.*

Існуюць выклікі і для ўразлівых груп насельніцтва. Да састарэлых часта прыходзяць спецыялісты і прапануюць, напрыклад, пачысціць выцяжныя вентыляцыйныя каналы. Гэтая паслуга каштуе рублёў 30. Аднак кампанія, зарэгістраваная пад назвай, якая вельмі падобная па сваім гучанні да назвы дзяржаўных арганізацый, можа ўвесці гэтым у зман. Яшчэ восенню сустракаліся скаргі, дзе людзі плацілі за такія «залатыя» паслугі, кошт якіх завышаны ў дзясяткі разоў, па 135 рублёў, а цяпер ёсць выпадкі і 170, удакладніла старшыня.

Ёсць яшчэ розныя прэзентацыі, куды запрашаюць людзей і дзе яны набываюць коўдры-падушкі-бялізну-посуд. Вярнуць потым гэты тавар вельмі цяжка, асабліва калі прэзентацыя была ў Мінску, а прадавец, напрыклад, у Гродне, заўважыла Ганна Суша:

*— Паштовае аддзяленне, якое абслугоўвае арганізацыі — пастаўшчыкоў пасцельнай бялізны, загружана пасылкамі, якія вяртаюць спажыўцы. Таму, калі тавар не падышоў пакупніку, ён мусіць паехаць у той горад, дзе знаходзіцца прадавец.*

**Ірына СІДАРОК.**

ИЗВЕЩЕНИЕ (ИНФОРМАЦИЯ) О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

# Государственное предприятие «МГЦН»

извещает о проведении **27 апреля 2021 года** аукционных торгов по продаже права заключения договоров аренды имущества **в рамках 304-го открытого аукциона по продаже права заключения договоров аренды** капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной и иной собственности (далее – имущество)

| № предмета аукциона | Местонахождение имущества | Площадь (кв. м) | Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы или размер арендной платы | Начальная цена права заключения договора аренды имущества (руб.) | Целевое использование имущества | Сумма задатка (руб.) | Наименование имущества, его характеристика, необходимые условия аренды и иные сведения |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | **Арендодатель – учреждение образования «Белорусский государственный медицинский университет»**, тел. +375 (17) 277 17 13 | | | | | | |
| 1 | г. Минск, пр-т Независимости, 71 | 339,6 | 3,0 | 1 434,81 | Под объект общественного питания (зона, свободная от курения) | 143,40 | Помещение общественного питания (330,8 кв. м) и венткамера (8,8 кв. м) в здании общежития. **Срок аренды 3 года.** (1*) |
| | *1* Имеются электроснабжение, отопление, система пожарной автоматики, холодное водоснабжение, санузел. Вход отдельный. Требуется ремонт за счет средств арендатора без последующей компенсации затрат* | | | | | | |
| | **Арендодатель – государственное учреждение «Республиканский научно-практический центр психического здоровья»**, тел. +375 (29) 501 57 32 | | | | | | |
| 2 | г. Минск, Долгиновский тракт, 152 | 19,4 | 1,0 | 81,97 | Под склад | 8,10 | Складское помещение. **Срок аренды 1 год.** (2*) |
| | *2* Имеются искусственное освещение, отопление, электроснабжение (сеть 230 В), пожарная сигнализация. Отсутствуют естественное освещение, телефонная связь, локальная сеть* | | | | | | |
| | **Арендодатель – Республиканское унитарное предприятие «Белорусский научно-исследовательский институт транспорта «Транстехника»,** тел.: +375 (17) 270 79 69, 270 86 03 | | | | | | |
| 3 | г. Минск, ул. Платонова, 24/1 (гараж); г. Минск, ул. Платонова, 24/2 (бытовка) | 57,5 | 2,0 | 242,94 | Под оказание услуг по техническому обслуживанию транспортных средств, склад | 24,20 | Два капитальных строения: (гараж – 42,6 кв. м, бытовка 14,9 кв. м). Стены кирпичные перекрытия железобетонные. Проведена электропроводка и освещение. Покрытие пола гаража – щебень, покрытие пола бытовки – линолеум. Ворота гаража металлические, входная дверь бытовки металлическая |
| 4 | г. Минск, ул. Платонова, 22А | 17,7 | 3,0 | 74,78 | Под административные цели (офис) | 7,40 | Изолированное помещение. Покрытие пола – линолеум. Входная дверь металлическая. Проведены электропроводка и освещение. Имеется отопление. **Срок аренды 3 года** |
| | **Арендодатель – УП «Минское отделение Белорусской железной дороги» станция Минск-Пассажирский,** тел.: +375 (17) 225 61 21, 225 69 77 | | | | | | |
| 5 | г. Минск, пл. Привокзальная, 5 | 15,4 | 23,1 БАВ | 65,07 | Под организацию услуг по предоставлению автомобилей в аренду, продажу сувенирной продукции, размещение салона связи, торговлю мобильными средствами связи или сопутствующими товарами (кроме товаров, бывших в употреблении, товаров ритуального назначения и пиротехнических изделий бытового назначения развлекательного характера) | 6,50 | Площадь в главном корпусе Северного железнодорожного вокзала (отметка +0,150, 1-й этаж). Имеются центральное отопление, естественное освещение, пожарная сигнализация и видеонаблюдение, включенные в общую систему вокзального комплекса. Вход общий. **Срок аренды 3 года.** (3*) |
| | *3* В ТЦ «Галилео» имеется платная парковка. Рядом расположены остановки городского транспорта, пригородного сообщения, автовокзал, станция метро «Площадь Ленина». Необходимые условия: страхование имущества, заключение договора на электроснабжение, возведение ограждающей конструкции из стекла (коленое) в границах, соответствующих техпаспорту на 07.10.2020 г., с соблюдением ТНПА в области строительства. Все работы за счет средств арендатора без последующей компенсации затрат* | | | | | | |
| | **Арендодатель – открытое акционерное общество «ПОЛИГРАФКОМБИНАТ ИМ. Я. КОЛАСА»,** тел.: +375 (17) 270 06 53, +375 (29) 564 63 44 | | | | | | |
| 6 | г. Минск, ул. Корженевского, 20/8 | 119,8 | 2,0; 3,0 (при применении понижающих коэффициентов) | 506,16 | Под офис, торговый объект, оказание услуг | 50,60 | Помещение на 1-м этаже. Отдельный вход с улицы. (4*) |
| 7 | г. Минск, ул. Асаналиева, 50 | 38,4 | 3,0 | 162,24 | Под офис, торговый объект, оказание услуг, допустимых в жилых помещениях | 16,20 | Встроенное помещение на 1-м этаже. Отдельный вход с улицы. (4*) |
| | *4* Имеются санузел, центральное отопление. Необходимые условия: проведение ремонта, разработка арендатором проекта на электроснабжение для последующего оформления в качестве субабонента арендодателя в филиале «Энергосбыт», регистрация в ЦРП «Водосбыт» как потребителя хозпитьевой воды* | | | | | | |
| | **Арендодатель – УП «Жильё»,** тел. +375 (177) 76 85 32 | | | | | | |
| 8 | Минская область, Борисовский р-н, г. Борисов, ул. 50 лет БССР, 3 | 57,9 | 1,0 | 244,63 | Под офис, организацию торговли непродовольственной группой товаров, оказание услуг (кроме ритуальных услуг и услуг по пользованию залами игровых автоматов, компьютерных игр и физкультурно-оздоровительной деятельности) с возможностью, при необходимости, использования части помещения под склад | 24,40 | Часть нежилого помещение в подвале жилого дома. Стены кирпичные. Имеются естественная вентиляция, центральное отопление. Имеется возможность подключения к электроэнергии. Санузел совместный с другими арендаторами. **Срок аренды 3 года.** (5*) |
| 9 | Минская область, Борисовский р-н, г. Борисов, ул. 3-го Интернационала, 66-21 | 63,29 | 3,0 | 267,40 | Под офис, организацию торговли непродовольственной и (или) продовольственной группой товаров с возможностью, при необходимости, использования части помещения под склад, оказание услуг (кроме ритуальных услуг (ритуальных магазинов) и услуг по пользованию залами игровых автоматов, компьютерных игр и физкультурно-оздоровительной деятельности) | 26,70 | Нежилое помещение на 1-м этаже жилого дома. Стены кирпичные. Имеются естественная вентиляция, центральное отопление, санузел. Электроснабжение отсутствует, имеется возможность его подключения. **Срок аренды 3 года.** (5*) |
| 10 | Минская область, Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Максима Горького, 86 | 59,5 | 1,0 | 251,39 | Под офис, организацию торговли непродовольственной группой товаров, оказание услуг (кроме ритуальных услуг и услуг по пользованию залами игровых автоматов, компьютерных игр и физкультурно-оздоровительной деятельности) с возможностью, при необходимости, использования части помещения под склад | 25,10 | Нежилое помещение в подвале многоквартирного жилого дома. Стены панельные, освещение – электропроводка скрытая, полы бетонные, плитка. Имеются естественная вентиляция, центральное отопление. **Срок аренды 3 года.** (5*) |
| 11 | Минская область, Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Чапаева, 34 | 9,8 | 3,0 | 41,41 | Под офис, организацию торговли непродовольственной группой товаров, склад, оказание услуг (за исключением ритуальных услуг и по пользованию залами игровых автоматов, компьютерных игр) | 4,10 | Часть нежилого помещения на 1-м этаже жилого дома. Стены кирпичные, освещение – электропроводка скрытая, полы бетонные. Имеются естественная вентиляция, центральное отопление. **Срок аренды 3 года.** (5*) |
| | *5* Необходимые условия: победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) помимо договора аренды обязан заключить договоры на вывоз твердо-бытовых отходов, на снабжение электрической энергией, на пользование тепловой энергией в горячей воде, на отпуск воды и прием сточных вод* | | | | | | |

Договор аренды заключается сроком на пять лет, если иное не указано в настоящем извещении.

**Организатор аукциона – государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 10, тел. + 375 (17) 360 42 22.**

Аукцион состоится **27 апреля 2021 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов).

Прием документов и консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 26 марта 2021 г. по 21 апреля 2021 г. включительно** в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. Заявления на участие в аукционе, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Ответственность за достоверность сведений, указанных в документах, представленных для участия в аукционе, несут лица, их подавшие.

**Порядок оформления участия в аукционе**

К участию в аукционе допускаются юридические или физические лица, в том числе индивидуальные предприниматели, внесшие в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на указанный текущий расчетный счет сумму задатка по соответствующему предмету аукциона, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление на участие в торгах с приложением всех необходимых документов, заключившие с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (далее – соглашение), зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах и получившие билеты участников аукциона с указанием порядковых номеров, под которыми данные лица зарегистрированы.

